ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ
ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 108 (490) Аўторак 27 верасьня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У АЎТОРАК, ЧАЦЬВЕР І СУБОТУ | ГОД ВЫД. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

ПРАЦЯГВАЕМ УСЕБЕЛАРУСКІ МІТЫНГ!

Зараз-жа практычна рыхтуйцеся да суботніка!

Менш агульных развважаньняў, больш дзелавой падрыхтоўкі.

Прамоўцаў запісалася шмат. Мітынг працягваецца. Хто жадае запісацца на слова?

Адна заўвага.

(Прамова прадстаўніка рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“).

Наш „мітынг“ сваю карысную справу ўжо пачаў рабіць.

Рэхам мітынговых прамоў зьяўляюцца весткі аб практычнай падрыхтоўцы да суботніка, аб тэхнічным „узброеньні“ ячэек у гэтых адносінах.

Гэта—справа добрая.

Але побач з гэтым неабходна ў ва ўсёй організацыі зрабіць такі настрой, што падрыхтоўка надыходзячага сьвята--гэта ня звычайная „хвілінная“ кампанія, што гэта справа, **якая ў нашай бягучай рабоце павінна зьявіцца адной з асноўных.**

У першую чаргу гэта датычыцца да нашага актыву, у часткі якога яшчэ прыкмячаюцца ня зусім уважлівыя адносіны да папярэдняй падрыхтоўкі да сьвята.

Гэта таксама датычыцца і да суботніка. У хуткім „пажарным“ парадку мы нічога зрабіць ня зможам--зараз не 1919 год. „Што пасееш, тое і пажнеш“. Ад падрыхтоўкі залежыць тры чвэрткі посьпеху.

Мы нашу кароценькую заўвагу робім у сувязі з тым, што гутаркі з ячэйковымі працаўнікамі паказалі, што ёсьць яшчэ таварышы, якія асабліва з папярэдняй падрыхтоўкай не сьпяшаюць, якія кажуць, што „падрыхтоўка ня воўк, у лес не ўцячэ“.

У „лес“ мабыць падрыхтоўка і не ўцячэ, а тое, што падрыхтоўку сьвята пры такіх адносінах можна праваліць--дык гэта факт.

Аб гэтым трэба памятаць.

Ладзім паравоз.

БАБРУЙСК. (Наш. кор.). Пастанова ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ узварушыла ячэйкі.

Падрыхтоўка распачалася... Аб выніках можна толькі часткова судзіць.

Акругком абвясьціў конкурс на лепшую ячэйку па гаспадарчай працы на вытворчасьці і ў вёсцы па сельскай гаспадарцы.

Некаторыя ячэйкі асобна рыхтуюць падарункі, лесазавод у Бабруйску і моладзь Жлобінскага дэпо ладзяць СТАРЫ ПАРАВОЗ, які 25-га кастрычніка ПАБЯЖЫЦЬ ПА РЭЙКАМ.

Ужо вядзецца кампанія па ўцягненьню старых рабочых у суботнік.

Вось пакуль што частковыя вынікі.

І. ЗАКАЎ.

Піонэры таксама павінны ўдзельнічаць.

Прамова тав. Адзінца.

(Старшыня ЦБ юных піонэраў)

Юныя піонэры—дзеці Кастрычніка—аб суботніках, якія праводзіў Комсамол у 1918-19-20 годзе, амаль ня ведаюць, ім было тады яшчэ вельмі мала год, але цяжкасьць жыцьця пакінула свой вялікі адбітак і на нашу дзетвару.

Ні адзін з таварышоў прасіў сваю матку, каб дастала хоць крошку хлеба, або бульбы, хоць і сырую абы кроху заглушыць голад. Тыя цяжкія гады і асабліва год галадоўкі 1921 пакінуў многа бяспрытульных.

Падарунак рабоча-сялянскай моладзі да 10-цігодзьдзя Кастрычніка ня можа прайсьці міма піонэрскай арганізацыі. Нам патрэбна ня толькі азнаёміцца з гэроічнай барацьбой рабочай і сялянскай моладзі ў часы грамадзянскай вайны на франтох, але і на гаспадарчых франтох—фабрыка, завод, чыгунка, суботнікі і інш.

Вельмі вялікае поле дзейнасьці мы маем для піонэраў вёскі па палепшаньню ле дабрабыту.

Атрад павінен дабіцца зараней ад комсамольскай ячэйкі, каб яна вызначыла яму работу, работу пасільную для піонэрскага ўзросту. Па думцы ЦБ ЮП такой работы хопіць усім атрадам.

Трэба паклапаціцца, каб грамадзкія студні былі абсыпаны каменьнем і пяском, такая абсыпка ня дасьць мажлівасьці прасочвацца бруднай вадзе з паверхні зямлі ў студню, такую работу прарабіць са школьнымі студнямі.

Вясною, у дзень лесу, былі пасаджаны дрэвы па шляхох. Гэтыя дрэвы ў большасьці паламаны, а піонэры аб гэтым чамусьці не падумалі, трэба забіць колікі, папрывязваць, каб такім парадкам пазбавіцца ад паломкі, абкапаць дрэвы грамадзкіх садоў.

Дарогі і масты ў большасьці месц паламаны, а то пабудованы вельмі дрэнна, ніхто ня можа гарантаваць сябе ад якой-небудзь паломкі—работы і тут па вушы

Высыпаць пяском каля сельсавету хатычытальні, каб такім чынам пазбавіцца ад гразі, якое заўсёды каля іх памяшканьняў па вушы, а чаму таксама ня прывесьці ў такі-ж парадак двор свайго бацькі, чаму-ж гэтага не рабіць бедняку сваёй вёскі.

Горш справа будзе абстаяць з гарадзкімі піонэрамі, бо на фабрыцы, або на заводзе такой работы, якую маглі-б выконваць піонэры, вельмі мала, з гэтай прычыны мы лічым патрэбным піонэраў прыцягваць толькі там, дзе знойдзе патрэбным камісія пры прадпрыемстве па правядзеньню суботніка.

Мы ўтвараем артыстычны „панядзелак“.

Прамова т. Табайніка.

(Старш. ЦП Саюзу працмастацтва).

Таварышы!

Наша моладзь Саюзу працмастацтва ня можа асобна організоўваць суботніку. Аб'яднаўшыся з астатнімі працаўнікамі, мы можам утварыць **артыстычны панядзелак,** які і зьявіцца нашым суботнікам».

Мы прыбавім старэйшых працаўнікоў, і пастараемся зрабіць так, каб наш «панядзелак» даў сапраўды што-небудзь рэальнае.

Гэта аб самым суботніку, а да яго, мы таксама шмат чаго можам даць.

Мы дадзім оркестры на час працы, мы організуем армію фото і кінопрацаўнікоў для адбіцьця суботніку.

Найвялікшая справа,—лепшыя традыцыі цяжкіх дзён Рэспублікі будуць паказаны на экране.

Канчаю сваю прапанову, абяцаючы комсамольскаму суботніку магчымае падтрыманьне.

Скончым недабудаваную школу.

Прамова т. Жука.

(Селянін вёскі Жукаўкі Лапіцкага сельсавету, Асіпавіцкага раёну, Бабруйскай акругі).

Жукаўку нашу сьцяной густою абкружаюць лясы непраходныя...

Кожную зіму хлопцы арцелямі ўходзяць на працу.

А суботнік будзе ўвосень ці можам, мы організаваць яго. Трэба адказаць, што зможам, утворым арцель: тыя, што маюць коняй, будуць адвозіць лес, а тыя, хто ня маюць—будуць грузіць.

Аб карысьці ня варта гаварыць, пагрузка і адвозка лесу добра аплачваецца.

Хачу я яшчэ некалькі слоў сказаць аб нашым падарунку да Кастрычніка. Ёсьць у нас школа у м. Лапічах, будуецца яна ўжо с 1925 г. і па гэтыя дні стаіць бяз страхі.

Некалькі ячэек могуць організавацца і дакончыць пабудову школы.

Усебеларуская нарада сялян.

15 удзельнікаў актыўна абгаварвалі пытаньні суботніка.

„Суботнік на вёсцы павінен працягнуцца некалькі дзён“.

Што гавораць аб суботніку, гаспадарчых падарунках і адзнаках вялікага дзесяцігодзьдзя нашыя сяляне.

Мы ўжо чулі прамовы на мітынгу, мы чулі прамовы гаспадарчых працаўнікоў на спэцыяльнай нарадзе, прысьвечанай суботніку...

І ўсё-ж цікава думка саміх сялян, якія амаль што ўсе слова **суботнік** чуюць у пяршыню.

Вось для гэтага была і склікана рэдакцыяй газэты «Чырвоная Зьмена» невялічкая нарада ў Цэнтральным Менскім Доме Селяніна.

Як і заўсёды, на нарадзе, было некалькі ўступных слоў...

Старыя дзядзькі ў зграбных сьвітках з кійкамі, клумачкамі ў руках і маладыя хлапцы на працягу больш як гадзіны вялі спрэчкі.

Вось гаворыць хлапец Кажэмскі з Юркавай - Сьцяны (Лепельскі раён, Полаччына).

— Некалькі месяцаў, год і дзён нам гавораць і прапануюць—рамантуйце дарогі. Спытайце любога селяніна з любой вёскі, ці зрабіў ён што-небудзь у гэтых адносінах. Адказ будзе нам вядомы—«нічога». А чаму нічога. Ні таму, што сялянства не сьвядомае, ці праца цяжкая, а таму, што некаму арганізаваць. РВК звычайна да гэтага адносіцца, па казённаму: нам што, ня мы езьдзім. Такое становішча і ў нашай вёсцы. Каб адрамантаваць дарогу, зрабіць яе прыгоднай, патрэбна невялікая падчынка,—пакласьці ў некаторых мясцох па пары слупоў. Селянін адзін асабіста ніколі ня нойдзе ладзіць. Вёску ўсю некаму арганізаваць, —а праца невялікая...

Ці, напрыклад, едзеш і прыходзіцца аб'яджджаць балоцістыя, нізкія месцы на дарозе, аб'яжджаючы зварачваеш на сенажаць на поле, псуеш яго, а чаго прасьцей—засыпаць гэтыя месцы і канаўку пракапаць.

Патрэбна ініцыятыва і арганізацыя, вось чаму суботнік сустрэне сапраўдную на справе патдрымку ўсяго сялянства.

Кажэмскі гаворыць яшчэ аб адной цікавай і значнай прапанове.

Гэта аб «дзялянках».

«Дзялянкі»,—месца, дзе некалі секлі лес, і яна засталася неачышчанай. Згаварыўшыся з лясьніцтвамі, з РВК, на дзялянках можам організаваць суботнік, які дасьць шмат грошай.

Прапановы Кажэмскага нарада падпарадкуе ўсебаковай крытыцы, нарэшце, просяць запісаць, што суботнік патрабуе падрыхтоўкі, і ў вёсцы, калі ўзята якаянебудзь **вялікая работа** (рамонт школ ці інш.) **суботнік павінен цягнуцца некалькі дзён, пакуль пачатая праца ня будзе скончана.**

Спрэчкі ідуць...

Янчанка Паўла (Забалоцкі сельсавет, Аршанскага раёну).

Лічыць, што лепшай, дзелавітай адзнакай Кастрычніка будзе тое, калі сялянства атрымае **добрае насеньне.**

— А насеньне адтрымаць добрае,—найвялікшая карысьць; нашыя бедныя палеткі, зморданыя трохполкаю, ад сорных траў, ой, як страдаюць...

Нарада заварушылася... Словы, насеньне, травы, трохполка, узьнялі сівыя галовы, што трэба, дык трэба, але-ж зернаачысьцільныя пункты далёка.

— А пачакайце, браткі, чуць не забыў,—зьбіваючыся, кажа Кажэмскі.

— Гэта-ж у нашай вёсцы трэ' было-б чырвонаармейкам дапамагчы, яны бедныя мучацца, некаторыя коняй ня маюць, пад азім заараць трэба.

Нехта сказануў аб апале для школ. Слова, кінутая незнарок, атрымоўвае 15 хвілін абгаворваньня.

Апал для школ. Звычайны апал і яго цяжка дастаць; цяжка дастаць праз непраходныя папяровыя гушчары «рыкаўскіх» канцэлярыяў.

— Хоць у лоб бі яму, а ён не дае для школы апалу.

І нарада патрабуе папярэдняй згаворанасьці з лясьніцтвамі аб **водпуску апалу для школ,** бо яго часьценька не даюць (Аршаншчына). І вёскі цалкам бяруцца выйсьці на суботнік, на загатоўку апалу для школ.

Сіняўка Антон. (Асіпавіцкі раён, Бабруйшчына).

Гаворыць аб **пажарных дружынах;** яму прыходзілася іесьці па Бабруйшчыне і Барысаўшчыне. І на працягу 40 вёрст, ані ў воднай вёсцы ня сустрэў пажарнай дружыны.

— Трэба іх організаваць...

— Але ўсё трэба,—кажа нарада,—і на рэшце згаджаюцца,—дзе ёсьць **магчымасьці і сродкі—організаваць,** а дзе няма, трымаць **сувязь з тымі, якія маюцца.**

Казакоў Раман. Саўхоз «Скрыншчына», Талочынскі раён, Аршанскай акругі).

Гаворыць, што работ для суботніка ў саўхозах можна шмат знайсьці. Але толькі суботнік павінен быць як можна хутчэй.

Казакоў Раман прапануе **організоўваць машынныя і малочныя таварыствы.**

Нарада гаворыць, што нельга організоўваць малочныя таварыствы там, дзе няма коопэрацыі. Некаторыя даказваюць, што магчыма толькі папярэдня высьвятлішы сбыт і колькасьць малака. Большасьць удзельнікаў лічыць, што **таварыствы можна організаваць** усе-ж і там, дзе **няма коопэрацыі.**

(Астатнія матар'ялы ў чарговым нумары).

Сёньня--першы дзень агляду абутковай фабрыкі.

Ці праў дырэктар фабрыкі, які кажа, што моладзь працуе дрэнна.

Чакаем водгукаў таварышоў. Якая думка па гэтым пытаньню дарослых рабочых.

У аглядзе павінны прыняць удзел усе рабочыя і работніцы. Толькі пры гэтай умове агляд дасьць добрыя вынікі.

Наш заклік.

Да рабочых і работніц Менскай абутковай фабрыкі.

Таварышы!

Рэдакцыя Цэнтральнай Комсамольскай газэты «Чырвоная Зьмена» рашыла правесьці агляд вашага прадпрыемства.

Агляд будзе прадаўжацца тры тыдні. Яго асноўная мэта: па-першае—высьветліць, як моладзь удзельнічае ў вытворчым жыцьці, якая якасьць выраблюемай імі продукцыі, узаемаадносіны паміж моладзю і майстрамі, а таксама са ўсімі дарослымі рабочымі. Нас цікавіць думка **ўсіх** рабочых і работніц аб рабоце комсамольскай ячэйкі, аб тым, якія недахопы ў яе працы трэба выправіць, якія дасягненьні пахваліць і па-другое, які быт моладзі, працуючай на фабрыцы (жыцьцё, паводзіны за сьценамі фабрыкі, адносіны з сям'ёй, ці разумна расходуецца заробак, якія ёсьць адмоўныя бакі ў быце моладзі).

Высоўваючы гэтыя два пытаньні, як асноўныя, рэдакцыя разам з тым напамінае, што агляд павінен ахапіць усё вытворчае жыцьцё фабрыкі, усе радасьці і гаркоты рабочага жыцьця-быцьця.

Выявіць дасягненьні і недахопы вашай фабрыкі, як дзецішча Кастрычніка, адна з задач агляду.

Як мы думаем правесьці агляд і ў чым ён будзе заключацца?

У часе агляду на фабрыцы увесь час будзе знаходзіцца ў памяшканьні клюбу выязная рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена». Агляд можа ўдацца толькі тады, калі **ўсе** бяз выключэньня рабочыя і работніцы прымуць у ім удзел.

Калі вам—рабочаму і работніцы—па якой-небудзь прычыне цяжка напісаць дапіс, дык зайдзеце ў клюб да прадстаўніка выязной рэдакцыі і ён запіша думкі выказаныя вамі. Дапісы могуць быць напісаны на той мове, на якой вам лягчэй гэта зрабіць.

Ваш матар'ял—допісы, водгукі на артыкулы і допісы другіх таварышоў будуць друкавацца у «Чырвонай Зьмене» і фабрычнай насьценнай газэце.

На кожную прапанову рабочага ці работніцы будзе давацца тлумачэньне адміністрацыі, фабкому ці ячэйкі.

Ні адна прапанова, ні адна парада не застануцца размовамі. Кожная прапанова, кожная парада будуць уважліва разглядацца.

Яшчэ раз мы заклікаем усіх рабочых і работніц прыняць удзел у аглядзе. Бяз удзелу ўсіх вас—агляд застанецца толькі пустой забавай.

Няхай жыве ўдзел усіх рабочых і работніц у аглядзе.

З таварыскім прывітаньнем:

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“.

Ня досыць сур'ёзна адносяцца да працы.

(Аб моладзі фабрыкі).

У нас на абутковай фабрыцы ў сучасны момант налічваецца ўсяго 100 чалавек вытворчых рабочых. Значнае месца сярод іх займае моладзь. Колькасьць яе разам з броньню дасягае 45 проц. агульнага ліку рабочых.

Наша фабрыка існуе ўсяго 3 гады. Моладзь, якая працуе на фабрыцы, абучалася раней у саматужнікаў. Цяжка было ёй прывыкаць да мэханізацыі фабрыкі.

Калі мы паглядзім на тыя дасягненьні, якія мае фабрыка да гэтага часу, дык трэба казаць, што значная частка іх прыпадае на моладзь.

Але ў некаторых засталіся яшчэ старыя перажыткі. Адсутнічаюць тыя сур'ёзныя адносіны да працы, якіх патрабуе фабрыка.

Наглядаецца недысцыплінаванасьць некаторых, асабліва ў нацяжным аддзяленьні. Моладзь у часы працы перакідваецца, займаецца дрэннай гутаркай. Перашкаджае ў працы сталым рабочым.

Наглядаюцца дрэнныя адносіны да старэйшых рабочых. Нават паміж сабою няма ў моладзі добрых адносін у часе працы. Праўда, за апошні час гэта наглядаецца больш рэдка.

Значны процант моладзі працуе на фабрыцы на кваліфікаванай пр ацы, астатнія на менш кваліфікаванай.

Гэта тлумачыцца тым, што на нашай фабрыцы не патрабуецца шмат кваліфікаваных рабочых. Заробчая плата моладзі ў сярэднім дасягае 70 руб. у месяц.

Ёсьць у нас і бронь--10 чалавек. Яны прымацаваны да майстроў, якім плоцяць за абучэньне вучняў.

Некаторыя з броні маюць добрыя посьпехі,—самастойна працуюць.

Трэба адзначыць, што некаторыя майстры дрэнна і няўважліва адносяцца да абучэньня вучняў.

Але наогул дасягненьні маюцца.

Дырэктар фабрыкі

Шэрман.

Абучэньне броні наладжваецца.

Усяго на фабрыцы працуе 8 чалавек броні і адзін звыш броні. З іх ліку 3 перарасткі, якія яшчэ не атрымалі кваліфікацыі.

Абучаюцца вучні без праграмы. Абучэньне ставіць сваёй мэтай даць кваліфікацыю на адной машыне.

Па рознаму ідзе абучэньне вучняў па аддзяленьнях.

У машынным аддзяленьні ўжо другі год працуе 3 вучні. Іх пасьпяховаму абучэньню перашкаджае тое, што вучань і майстар працуюць на адной машыне. Пакуль майстар падрыхтуе запас, каб рабочыя не стаялі без работы, вучань выконвае падсобную працу: устаўляе цьвікі ў машыну. Толькі тады, калі запас ёсьць, майстар перадае машыну вучню і сочыць за яго працай. Але гэта выходзіць вельмі рэдка.

Напр., вучню Гарынсону, які прымацован да майстра Цырліна, прыходзіцца работаць на машыне ня больш 2-3 гадзін у тыдзень.

А вось вучань Баброўскі, які разам з майстрам працуе на 3 машынах, хутка кваліфікуецца.

У той час, як другім вучням экспэртна-вучнёўская камісія набаўляе разрад праз кожныя 6 м-цаў, яму-ж па яго заяве раней набавілі разрад. Хлапец ужо добра працуе.

Вучні загатовачнага аддзяленьня маюць кожны сваю машыну. Але да гэтага часу ім усё давалі некваліфікаваную работу і абучэньне праходзіла марудна.

Пытаньне гэта было пастаўлена на пасяджэньні завкому і месяц таму назад становішча вучняў палепшылася. Абучэньне наладжваецца.

У штамповачным аддзяленьні працуе адзін вучань. Там мала кваліфікаваных машын. Але пакрыху вучні абучаюцца кваліфікацыі свайго аддзяленьня.

Добра абстаіць справа з абучэньнем вучня ў сьлясарным аддзяленьні. Там майстар працуе памесячна. Затое добра абучае вучня і ня просіць за гэта кампэнсацыі.

Большая частка вучняў атрымоўвае заробак па 3 разраду, 2 па чацьвертаму і 1 па другому.

Калі вучань дасягае 5 разраду ён з броні пераводзіцца ў штат.

Праз 4—5 месяцаў перарасткі будуць разбраніраваны.

А. Шляпачнікаў.

У вольныя хвіліны.

У нацяжным аддзяленьні дрэнна

Хто тут вінаваты

Нядаўна на пасяджэньні бюро ячэйк ЛКСМБ сумесна з актывам стаяла пытаньне аб паводзінах комсамольцаў у нацяжным аддзяленьні. Там высьвятлілася што большая частка вымоў, якія выносяцца адміністрацыяй рабочым за спазьненьні на работу, за псаваньне і іншыя парушэньні ўнутрыфабрычнага рэжыму, падаюць на моладзь нацяжнога аддзяленьня.

І хоць некаторыя з моладзі і казалі, што бывалі выпадкі, калі яны атрымоўвалі вымовы ня маючы на гэта падставы (пры спазьненьні на 5 хвілін, давалі вымову за спазьненьне на 25 хвілін і інш.) але гэта толькі выпадкі, а наогул гэты факт аб нечым гаворыць.

Дарослыя рабочыя скардзяцца на моладзь, што яна перашкаджае ім работаць. Кідаецца клеем, і іншымі рэчамі, вядзе непрыстойныя гутаркі.

Адзін стары рабочы нават раз заявіў загадчыку фабрыкі, што ня прыдзе заўтра на работу. Чаму гэта?—пытае загадчык. Рабочы нічога не адказаў. Пазьней выявілася, што з прычыны дрэнных адносін да яго моладзі.

Моладзь у сваю чаргу скардзіцца на дрэнныя адносіны да ; яе майстра Шыманскага.

Пакуль што адносіны паміж дарослымі рабочымі і моладзьдзю ў нацяжным аддзяленьні дрэнныя.

Хто тут вінаваты?

Словы і справы.

(Астрашыцкі Гарадок).

Актывісты будзе тады аўтарытэтным сярод комсамольцаў і беспартыйных—калі будзе сам прыкладным ва ўсіх адносінах.

Вось сэкратар ячэйкі пры профсаюзах **Смарговіч**—добры прамоўца і добры юнкор «Чырвонай Зьмены».

У часе кампаніі па распаўсюджваньню «Чырвонай Зьмены» ён добра агітаваў за падпіску.

А калі нейкія вочы праверылі самаго прамоўцу,—аказалася: ён ня толькі не выпісвае газэту, але нават лае яе—«яна толькі для піонэраў, сорамна яе чытаць»—гаварыў ён многім.

Ён добра агітаваў за ваенізацыю, за абарону краіны Саветаў і супроць капіталістычных акул, якія пагражаюць нам вайной.

... Але на занятках вайсковага гуртка яго ня ўбачыце, ён, бачыце, сядзіць ля райкому з аднэй комсамолкай і мабыць так сама праводзіць «індывідуальную агітацыю».

Комсамольцы спачатку цярпелі, а потым паднялі шум.

Ці-ж комсамольцы будуць цяпер слухаць даклады свайго сэкратара, наогул яго агітацыю? Памойму не.

Крывалап.

Міжнародны ягляд.

Балбатня Лігі Нацый.

Ліга Нацый бясьсільна ў пытаньні разброеньня.— Разброеньне на мове буржуазі—і гэта хлусьня і фальшывасьць.—На словах разброеньне,а на справе павялічэньне арміі і марскога флёту.—На пасяджэньнях Лігі Нацый Чэмбэрлен праводзіць свае пляны, накіраваныя супроць СССР.

Пускаюць пыл у вочы працоўных.

Пры сучасным напружаным міжнародным становішчы, пашыранае пасяджэньне Лігі Нацый, на якім абгаварвалася пытаньне аб забесьпячэньні міру, здавалася-б павінна мець вялізарнае міжнароднае значэньне.

Аднак, гэта ня так.

Чым больш імпэрыялістыя рыхтуюцца да новых боек, тым больш заўзята яны пускаюць у ход балбатню аб іх, нібыта, выключна «мірных» настроях.

І буржуазны друк, і шмат конфэрэнцый капіталістычных дыплёматаў сыстэматычна займаюцца абманам народных мас, каб увесьці іх у аблуду адносна сапраўдных намераў і каб пад шум аб „міру і сяброўстве ўсіх народаў“ весьці шалёную падрыхтоўку да новых войнаў.

Комэдыя разброеньня мае ўжо досыць доўгую гісторыю.

Пытаньні разброеньня не адзін раз прыцягвалі ўвагу Лігі Нацый.

Ні адзін раз жэнеўскія «міраробцы» безнадзейна гутарылі на тэмы аб гандлі зброяй, аб абмене ваеннымі ведамі, газавай вайне і марскім разброеньні.

Гісторыя балбатні па разброеньні.

Яшчэ ў верасьні 1919 году паміж капіталістычнымі краінамі была падпісана згода, якая ўстанаўляла правілы над міжнародным гандлем зброяй.

Але лёс гэтай згоды быў нешчасьлівым. Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі адмовіліся ад зацьвярджэньня гэтай згоды.

Не ўваходзячы, як вядома, у Лігу Нацый, Злучаныя Штаты не згадзіліся на тое, каб не гандляваць сваёй зброяй з іншымі краінамі.

Зьяўляючыся буйным дастаўшчыком зброі ў Эўропу і асабліва ў Паўднёвую Амэрыку, Злучаныя Штаты не маглі згадзіцца з гэтай прапановай.

Толькі праз пяць гадоў пасьля прыняцьця згоды, Злучаныя Штаты згадзіліся прыняць удзел у яе пераглядзе.

Пры гэтым амэрыканцы бязьлітасна выкінулі ўсё тое, што ім не падабалася.

Тады у Жэневе 17 ліпеня 1925 году быў падпісаны новы дагавор адносна гандлю зброяй.

З часу падпісаньня Жэнеўскага дагавору прайшло больш двох гадоў, а ён і па гэты час застаецца не зацьверджаным.

Ня будзе нічога дзіўнага, калі гэты ўгавор зусім ніколі не зацьвердзіцца.

Ува ўсякім выпадку, на гэты час Ліга Нацый у справе кантролю над міжнародным гандлем зброяй нічога не зрабіла.

Артыкул статуту Лігі Нацый кажа так:

«Сябры Лігі павінны адкрыта абменьвацца ведамі адносна маштабу іх узброеньня і стану тых галін прамысловасьці, якія могуць быць скарыстаны для вайны».

Але ўсё гэта ёсьць ня што іншае, як хлусьня і фальшывасьць.

Які дурань мог бы хоць на хвіліну дапусьціць, што генэральныя штабы Англіі, Францыі, Нямеччыны, Польшчы і г. д. пачнуць паведамляць аб сваіх ваенных плянах.

Вядома, яны іх трымаюць у сакрэце. Як-жа выкруціцца чыноўнікам Лігі Нацый з гэткага становішча?

Вельмі проста. Усе тыя паведамленьні, якія друкуюцца ўрадамі, сэкратарыят зьбірае і выдае ў выглядзе ваеннага штогодніка.

Праўда, усім ясна, што дзяржавы захоўваюць свае пляны адносна разьмераў сваёй ваеннай зброі.

Ня гледзячы на гэта, Ліга Нацый прызнала, што выданьне ваеннага штогодніка і ёсьць пачатак выпаўненьня таго артыкулу свайго статуту, які намі пададзен вышэй. І на гэтым супакоіліся.

Такім чынам, у справе абмену ваеннымі ведамі Ліга Нацый не дасягнула ніякіх вынікаў.

Газавая вайна была забаронена яшчэ да пачатку імпэрыялістычнай вайны 1914 году. Тым ня менш, гэта не перашкодзіла пусьціць газы ў ход. Пасьля сканчэньня імпэрыялістычнай вайны забароненьне газавай вайны было паўторана ў Версальскім угаворы і іншымі мірнымі угаворамі.

Урэшце, гэта было забаронена і ў пратаколе Лігі Нацый, які быў падпісан у 1925 годзе.

Ня гледзячы на ўсё гэта, усе буржуазныя дзяржавы рыхтуюцца да ўжываньня газаў у будучых войнах.

Значыць і па гэтаму пытаньню, па пытаньню ў галіне барацьбы з хэмічнай вайной, Ліга Нацый ня мае ніякіх дасягненьняў.

Гісторыя марскога разброеньня яшчэ больш цікава.

Яна пачалася ў лютым 1922 году і апошнім яе этапам зьяўляецца «тройсьцьвенная» конфэрэнцыя, якая адбылася ўлетку гэтага году ў Жэневе.

На гэтай апошняй конфэрэнцыі трэба было, па іх плянах, вызначыць для Злучаных Штатаў Амэрыкі, Англіі і Японіі магчымыя нормы марскога флёту.

Але зрабіць гэтай конфэрэнцыі нічога путнага, што-б вяло да абмежаваньня росту марскога флёту памяненых краін—не ўдалося.

Англія не згадзілася з прапановай Амэрыкі аб зьмяншэньні свайго флёту.

Такжа сама і Японія.

Значыцца балбатня і марскога разбраеньня скончылася ў пустую.

І як пасьля ўсяго гэтага могуць варочацца языкі соцыял-згоднікаў аб тым, што пасяджэньне Лігі Нацый прыняло добрую пастанову аб разброеньні і бясьпечнасьці.

Хіба-ж яны сьляпыя і ня бачаць, што на працягу некалькіх гад ідзе балбатня аб разброеньні, а на справе кожная капіталістычная дзяржава ўсё больш і больш рыхтуе свае сілы да новай сусьветнай бойкі!

Ліга—бясьсільна забясьпечыць мір.

Як паказаў нядаўны пленум Лігі Нацый, кожная з буйных капіталістычных дзяржаў жадае, каб мерапрыемствы па забесьпячэньні міра адпавядалі, раней усяго, яе інтарэсам.

Для Францыі забясьпечаньне міру азначае—забясьпечаньне тых зямель, якія захоплены ёю і яе саюзьніцай Польшчай.

Для Нямеччыны наадварот. Ніякае «уміратварэньне» немагчыма,, покуль Ліга не дапаможа вярнуць ёй ранейшыя тэрыторыі, якія пасьля вайны адыйшлі да Польшчы.

Англія-ж жадае, каб Ліга абмежавалася гутаркамі аб міру і гэтымі гутаркамі прыкрыла-б яе падрыхтоўку да нападу на СССР. Адна ангельская газэта кажа аб гэтым вельмі ясна:

— «Значэньне пленуму Лігі Нацый,—піша яна,—ня ў спрэчках і не ў пастановах, якія будуць прыняты на пасяджэньнях пленуму. Значэньне яго ў тых прыватных гутарках, якія вядуць паміж сабою прыехаўшыя на пленум міністры.

А што абгаварваецца ў гэтых прыватных гутарках—добра вядома.

Абгаварваюцца чарговыя проэкты Чэмбэрлена па організацыі адзінага фронту і падрыхто8кі базы для нападу на СССР».

Вось што піша пра Лігу Нацый ангельская буржуазная ўрадавая газэта.

Вось да выкананьня якіх плянаў накіравана ўся «праца» Лігі Нацый.

Верыць-жа, што Ліга можа адыграць хоць маленькую ролю ў пытаньні скарачэньня ўзброеньня, у пытаньні адхіленьня новай вайны—вядома ніхто ня зьбіраецца.

Сваю «працаздольнасьць» у вырашэньні ўсіх гэтых пытаньняў яна надзвычайна добра паказала працоўным масам на працягу апошніх гадоў.

І вядома, ніхто не расцэньвае яе працы інакш, як нікчэмную балтаўню, якая прывесьці да міру паміж народамі ні ў якім разе ня можа.

Алёнін.

Калі піонэры з ахвотай ідуць у атрад...

ДЗЕЛІМСЯ ВОПЫТАМ ЖЫВОЙ І ЦІКАВАЙ РАБОТЫ.

Чакаем ад дапішчыкаў, піонэрскіх і комсамольскіх працаўнікоў, а таксама ад саміх піонэраў допісаў аб лепшых прыкладах піонэрскай работы.

Агляд працягваецца. Увага агляду!

Чаравікі і боты--бяспрытульным.

(Насовіцкі раён, Гомельскай акругі).

Піонэры дзяжураць у хатах-чытальнях і нардомах (Лагуны, Чарпянка і Падабранка). Прымаюць удзел у працы бібліотэчнага гуртка і дапамагаюць яму ў працы (Насовічы). Маюцца грамадзкія організацыі, сябрамі якіх састаяць піонэр-атрады—МОПР і ТСД. Праца ТСД пры адным атрадзе выявілася ў пастаноўцы спэктакляў на карысьць бяспрытульным.

У Хадабранцы комсамольская ячэйка, на вырučаныя піонэрамі грошы ад пастаноўкі спэктаклю, закупіла матар'ял, і комсамольцы пашылі бяспрытульным боты і чаравікі.

Калі адбываліся перавыбары сельсаветаў, піонэры малявалі дыяграмы і разносілі выбарчыя позвы.

Праца сярод неорганізаваных дзяцей вядзецца, але пэрыодычна і выяўляецца ў пастаноўцы спэктакляў і масавых гульняў.

У школе піонэры прыбіралі клясы, прымалі ўдзел у школьным самакіраваньні. У двух школах організавалі пераплётныя майстэрні, і атрыманыя грошы ішлі на карысьць дзяцей Заходняй Беларусі.

Вясной былі дадзены піонэратрадам заданьні: «аб ахове карысных птушак» і «як організаваць агарод». Акрамя гэтага, райбюро склікала нараду павадыроў, дзе сумесна з аграномам прапрацована пытаньне аб сельска-гаспадарчай працы. На сёньнешні дзень у нашым раёне мы маем організаваных—7 колектыўных агародаў і асобных градак (Прыбыткі, Дуянаўка, Івакі, Насовічы, Прохараўка, Чэрацянка і Падабранка).

Цэляшэўская.

Сваімі рукамі.

(Рагачоўскі раён, Бабруйскай акругі).

Каб праверыць, што робяць піонэрскія атрады і як пастаўлена праца па набыцьцю тэхнічна-працоўных навыкаў, Рагачоўскі райком комсамолу правеў раённую выстаўку гэтай працы. За месяц да выстаўкі была разгорнута падрыхтоўчая праца ў атрадах. Кожны атрад рыхтаваўся да выстаўкі, і ўсе з нецярплівасьцю чакалі яе. Ужо за тыдзень да выстаўкі, атрады пачалі прыносіць зробленыя рэчы, а ка дню выстаўкі—10-га красавіка--было столькі матар'ялу, што мы гэтулькі і не чакалі.

Што было на выстаўцы.

Модэляў на выстаўцы было каля 60, з якіх больш характэрнымі зьяўляюцца: цягнік з вагонамі, вятрак, выгляд памяшканьня дзятдому, моўзалей Леніна, дзьве модэлі сакалёту, выгляд дрэваапрацовачнага заводу і шмат іншых рэчаў, больш характэрных для гарадзкога жыцьця.

Модэлі, адбіваючыя вясковае жыцьцё: ручная крахмалка, якою можна карыстацца ў гаспадарцы (праца двух вясковых піонэраў), тры ткацкіх варштаты (кросны), з якіх на двух маюцца кавалкі вытканага палатна, дзьве самапрадкі, плуг, барана, сані, конская збруя і інш.

Вялікую ўвагу гледачоў зьвярнула на сябе работа гуртка ручной працы пры цэнтральным піонэрклюбе. Былі досыць добрыя рэчы, якія адбіваюць гарадзкое і вясковае жыцьцё. Нельга не сказаць і пра ўдзел акцябрат у выстаўцы, матар'ял якіх вельмі зацікавіў гледачоў выстаўкі: вырэзкі, будынкі з кардону, ручная праца і інш. Мілаславіцкі атрад за тры гады перадаў у комсамол 26 піонэраў, профшкольскі – 17 піонэраў.

Мэтад заданьняў узварухнуў усю працу ў піонэратрадах. Атрад саўхозу Ціманава распрацаваў надта добра сельска-гаспадарчыя заданьні: «значнасьць агародніцтва ў сельскай гаспадарцы». У выніку распрацоўкі гэтага заданьня, атрад зрабіў свой піонэрагарод з 36 градкамі. Родненскі атрад распрацаваў заданьне: «санітарыя ў вёсцы». У выніку—атрад паклаў з каменьняў мосьцік каля калодзежу.

Курлукоў.

Малнныкія будзёнаўцы.

У акцябрат.

(Гарадок, Бабруйскай акругі.)

Група акцябрат організавалася ў 1926 годзе. Спачатку праводзіліся гутаркі, што такое акцябраты. Якім павінен быць акцябронак. Праводзіліся гульні, сьпевы, пагулянкі. Зьбіралі лячэбныя травы.

Акцябраты займаліся дома. На двох зборах займаліся шыцьцём; акцябраты прыносілі з сабою іголкі, ніткі і кавалкі матэрыі.

На першы раз парашылі выканаць такое заданьне: пашыць спадніцу. Усе прыняліся за працу: хто рэжа матэрыю, хто шые, і, такім чынам, пашылі спадніцу. На гэтых занятках самі папраўлялі вопратку тым, у каго яна была парваная; пасьля адбыліся гульні і сьпевы. У другі раз рабіліся кошыкі і кветкі з паперы; гэтымі кветкамі і кошыкамі ўпрыгожвалі куткі ў хаце і школе.

На занятках групы малявалі, чыталі газэты і часопісь.

Матак гэта праца вельмі зацікавіла; яны самі паказвалі на занятках, як трэба шыць. Некаторыя з іх казалі: мы думалі, што акцябрат вучаць толькі гуляць ды сьпяваць.

Акцябраты і некаторыя піонэры самастойна злажылі п'еску. Добра вывучылі яе і наладзілі спэктакль для бацькоў. Пасьля першага спэктаклю дзеці злажылі другую п'еску і на гэты раз паставілі платны спэктакль. На апошнім было шмат дарослых.

На сродкі ад спэктаклю выпісалі газэты, купілі кнігі і г. д.

У часе кампаніі па дапамозе дзецям Заходняй Беларусі, акцябраты сабралі 1 р. 25 кап.

Градкі на „Сьвятую Тройцу“.

(Саўхоз «Чырвоная Зорка» Глускі раён, Бабруйшчына).

Падышло сьвята «Сьвятая Тройца». Замест таго, каб пайсьці пагуляць, піонэры пашлі да кіраўніка саўхозу, узялі ў яго коняй, плуг і іншыя прылады і ўзаралі вялікі вучастак зямлі. Потым пашлі за насеньнем розных сартоў. Прыцягнулі агародніка (практыканта), які і растлумачыў нам, як апрацаваць градкі, як лепш садзіць. Такім чынам, было засеяна тры вялізарныя грады розных агароднін. Аднэй капусты было каля 200 галоў.

Мы правялі вялікую працу па барацьбе са шкоднікамі садоў і розных расьлін.

Мы правялі пасьля ўсей сельска-гаспадарчай працы вечар, куды запрасілі сваіх бацькоў і сялян вёскі. Аўтарытэт наш значна ўзрос.

Кузьма Гарбулька.

Наша будаўніцтва.

(Клімавіцкі раён).

Па агляду дасягненьняў у піонэррабоце Клімавіцкі райком комсамолу вылучыў камісію, апошняя правяла агляд 6 гарадзкіх, 10 вясковых і 3 местачковых атрадаў.

У галіне грамадзкай працы піонэрскія атрады заваявалі значны аўтарытэт сярод насельніцтва ў сваіх бацькоў. Іванаўскі, Паўловіцкі і профшкольскі атрады **зрабілі пасадку дрэў каля дарог школы і ў сябе** каля хат. Саўхозкі атрад зрабіў **паказальны піонэрагарод** з дапамогай агранома, гэты атрад ўзімку **дапамог сем'ям чырвонаармейцаў**: рэзаў дровы. Родненскі атрад **паслаў з каменьняў мосьцік каля калодзежу** і ў некаторых хатках сялян дапамог зьнішчыць блашчыц і тараканаў. Мілаславіцкі атрад **падчыніў мосьцік.**

У галіне выхаваўчай працы мы маем паляпшэньне дысцыпліны. Увраслo палітычнае разьвіцьце піонэраў, узрос лік піонэраў-комсамольцаў.

З вуліцы--на вечар.

Масавыя вечары і пагулянкі—гэта найлепшы спосаб працы сярод неорганізаваных дзяцей.

Шмат думалі нашы піонэры над тым, як наладзіць працу сярод неорганізаваных дзяцей. Некалькі разоў спрабавалі рабіць сходы неорганізаваных дзяцей, але на іх ніхто ня прыходзіў: «сухія» сходы ня цікавілі.

Першы такі вечар для неорганізаваных дзяцей старобінскія піонэры (Случчына) наладзілі ў дзень Чырвонай арміі. На гэты вечар прышла ўся дзетвары мястэчка. Пелі прыпеўкі і частушкі пад гармонік, пасьля рабіў успаміны стары чырвонаармеец. Успаміны былі цікавыя—аб паляках. Потым піонэры-вучні і іншыя дзеці расказвалі вясёлыя апавяданьні, дэклямавалі, пелі, а ў канцы скакалі «казачка» пад гармонік. Вечар закончыўся прамовай павадыра. Два другія вечары прашлі яшчэ лепш. Усе неорганізаваныя дзеці, якія раней не хацелі к нам хадзіць, цяпер ідуць з ахвотай.

Такія вечары мы праводзім амаль кожны тыдзень.

Р—н.

У піонэрскім лягеры.

Організоўваем досуг піонєраў.

(Песачанскі с.-с., Копыльскага раёну)

Дзеткалёнія «Антонава» наладзіла нядаўна экскурсію. Па дарозе была праведзена гутарка павадыра і агронома аб расьлінах, якія знаходзіліся недалёка ад дарогі.

— Як гэта ўгнойваць глебу, каб лепш расьлі расьліны?

— А якія расьліны прыносяць карысьць для сельскай гаспадаркі?—Пыталі піонэры.

Прышлі ў колектыў «Росквіт», там дзецям паказалі як робіцца сыравіна і г. д. Зьдзівіліся дзеці як гэта хутка, у 10 хвілін, робіцца квашанае малако.

— А ў нашай вёсцы дык цёткі квасяць па некалькі дзён!

Піонэры самі вучыліся рабіць сыры, круцілі сэпаратар, выціскалі сыроваткі і г. д.

Потым экскурсія накіравалася ў вёску Сьвінку, дзе быў разгледжан пітомнік саду.

Экскурсанты пакупаліся і калі сонейка ўжо было высока, накіраваліся дамоў. Такія экскурсіі надта ажыўляюць працу вясковага піонэратраду. Такі досуг--па нашаму самы лепшы і разумны досуг.

Луцэвіч П.

З лемантарамі пад пахаю.

(Гарадзецкі атрад, Бабруйшчына).

Выканаць заданьне па зьнішчэньню няпісьменнасьці мы даручылі асобным зьвеньням. Адно зьвяно пашло ў пасёлак, зрабіла падлік няпісьменных і правяло з імі два сходы, дзе было растлумачана пытаньне аб зьнішчэньні няпісьменнасьці. Пасьля гэтага наладзілі заняткі.

Другое зьвяно, разам з настаўнікам, арганізавала заняткі з дарослымі няпісьменнымі. Цяпер, дзякуючы нашай працы, 15 няпісьменных дзяцей прысутнічаюць на занятках 3 разы ў тыдзень, дзе вучацца чытаць і пісаць.

Зараз піонэры рыхтуюць платны спэктакль на карысьць няпісьменных; за сабраныя грошы будуць куплены алоўкі, сшыткі і літаратура.

Саснова.

Агарод і кніжка.

(Рудзінская школа, Сьмілавіцкага раёну).

Пры Рудзенскай школе маецца кавалак поля, які раней заўсёды пуставаў.

Мінулаю вясной школа скарыстала яго пад агарод, як паказальны вучастак. Дзеці выпрасілі ў бацькоў па некалькі капеек і закупілі для агарода насеньне завадзкога гатунку. І вось на агародзе распачалася праца: дзеці рабілі градкі, сеялі, саджалі караньплоды пад наглядам настаўнікаў школы.

Прышла восень. Люба было прайсьціся ля град: усё парасло лепш, чым на суседніх агародах. Асабліва здаволены бацькі, дзеці якіх працавалі на агародзе.

А калі прышла зіма і ў школе пачаліся заняткі, на дапамогу дзецям, нямаючым кніжак, прышоў агарод. Прадалі агародніну, якую вырасьцілі за лета і атрымалі за яе 70 руб. За гэтыя грошы купілі кнігі.

Лётарэя--для кітайскіх дзяцей.

(Мястэчка Ушачы, Полаччына).

Распрацоўваючы заданьне „Дапаможам дзецям Кітаю“, атрад пастанавіў організаваць лётарэю.

Піонэры адразу ўзяліся за організацыю.

— Дзе возьмем рэчы?—пытаюцца адны.

— Зьбярэм свае!—чуецца адказ. Так і зрабілі.

Зьбіраць розныя рэчы для лётарэі паміж піонэраў і неорганізаваных дзяцей узяліся два зьвяны. У выніку работы двух звеньняў было сабрана 53 штук розных рэчаў. Тут былі: кніжкі, сшыткі, алоўкі, мыла, зубны парашок і г. д.

Лётарэйны білет каштаваў 5 кап. Розыгрыш адбыўся. Усяго сабрана праз лётарэю 10 рублёў. Гэтыя грошы мы адаслалі кітайскім дзецям.

Зьм. Хвойка.

Як мы завербавалі дапішчыкаў.

(Вопыт бранскіх піонэраў).

Першае, што кідаецца ў вочы пры ўваходзе ў клюб—гэта насьценныя газэты. Пры насьценгазэце з самага пачатку працаваў гурток дзяткораў. У гуртку займаліся 23 чалавекі.

Калі ў першым нумары яшчэ сустракаліся допісы, падобныя на сухія справаздачы, дык у апошняй насьценгазэце ў кутку «Наша творчасьць» зьявіліся ня дрэнныя апавяданьні з жыцьця бяспрытульных і вершы. У гуртку дзяткораў праводзіліся гутаркі аб тым, як трэба пісаць, якім павінен быць дзяткор; кожны нумар газэты гурток колектыўна абмяркоўваў. Часта на занятках разьбіраліся артыкулы з «Ленинской Искры» і «Піонэрскай Праўды». У школе гурток рашыў правесьці абсьледваньне, якія газэты чытаюць вучні. Піонэрскія газэты чытаюць усяго некалькі чалавек. Многія праглядаюць і то рэдка, галоўным чынам, рабочыя і комсамольскія газэты. Гурток рашыў, што трэба біць трывогу, і тут-жа пастанавіў: «Павесьці агітацыю за падпіску на «Пионерскую Правду». У выніку было сабрана 35 чалавек новых падпішчыкаў.

НА ВАРЦЕ САВЕЦКІХ МЕЖАЎ.

У ВАЙСКОВЫХ ГУРТКОХ, У РАБОЧЫХ БАТАЛЬЛЁНАХ РЫХТУЕЦЦА МОЛАДЗЬ ДА АБАРОНЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ.

ПРАВЕРЫМ, ЯК ПРАЦУЮЦЬ ВАЙСКОВЫЯ ГУРТКІ, УЗМОЦНІМ ІХ ДЗЕЙНАСЬЦЬ, УЦЯГНЕМ НОВЫЯ КОЛЫ МОЛАДЗІ.

Як працаваць у ваенным гуртку.

Занятні ў полі.

Каб выхаваць у сяброх ваеннага гуртку баявыя якасьці, трэба часьцей наладжваць выхады ў поле.

Днямі выхадаў у поле лепш за ўсё выбіраць сьвяточныя дні, калі ёсьць магчымасьць вылучыць больш часу для заняткаў у полі.

Вышаўшы ў поле, кіраўнікі заняткаў раней за ўсё знаёмяць сяброў гуртка з значэньнем мясцовасьці ў баявых абставінах і з уменьнем прымяніцца к ёй.

Для гэтага, адвёўшы адну групу займаючыхся на 600—800 крокаў, трэба паказаць другой групе, як кожны ўзгорак, камень, куст і г. п. у баявых абставінах мае надзвычайна вялікае значэньне і можа служыць ці ўпорам для стральбы з вінтоўкі, ці захоўваць стралка ад праціўніка. Разам з гэтым трэба даць разуменьне аб рэльефу мясцовасьці і тут-жа на практыцы паказаць, дзе знаходзіцца вяршына, грэбень, нізіна і г. д. Потым даць разуменьне аб прыёмах маскіроўкі адзіночнага байца і навучыць будаваць найпрасьцейшыя выгляды акопаў для ўсіх стральб.

У часе наступнага выхаду ў поле трэба навучыць гурток вокамернаму азначэньню адлегласьці да цэлі, прыгатоўцы з розных становішчаў і прыцэльваньню на сапраўдную адлегласьць. Тут гурток на практыцы пераканаецца, што вялікія прадметы здаюцца бліжэй, а малыя на той-жа адлегласьці ад іх—далей і што пры азначэньні адлегласьці трэба ўлічваць і складкі мясцовасьці і рознае асьвятленьне прадметаў.

Даючы разуменьне аб азначэньні адлегласьці да цэляў, трэба выкарыстоўваць мясцовасьць для вывучэньня прыёмаў прыгатоўкі з розных упораў (бугры, канавы, камні і г. д.) і паказаць, што трэба прарабіць, каб прыгатовіцца к бою (заражаньне вінтоўкі, азначэньне адлегласьці і ўстаноўка прыцэлу).

Па меры атрыманьня практычных навыкаў можна азнаеміць гурток з строямі аддзяленьня і тэхнікай яго руху пад агнём праціўніка: перабежка, перапаўзаньне, скрыты рух. У часе гэтага заняцьця сябры гуртка даведваюцца аб абавязках асобнага байца ў баю і ўвесь час будуць практыкавацца ў рашэньнях нескладаных тактычна-стралковых задач.

Калі гурток правядзе некалькі заняткаў у полі, добра зрабіць праверку пройдзенага на занятках шляхам самастойнага рашэньня рознага роду задач. Для правядзеньня заняткаў гурток падзяляецца на дзьве часткі.

Толькі правяраючы сваю баявую вывучку ў полі, стралок можа падрыхтавацца да працы ў сапраўднай бойцы.

Н. К.

Як прыгожы былі пастановы...

(Ячэйка ЛКСМБ, пуці і руху станцыі Менск МББ чыгункі).

Каля пяці месяцаў будзе, як організаваўся вайсковы гурток пры ячэйках ЛКСМБ, службы пуці і руху станцыі Менск МББ чыгункі.

Ячэйкі вынесьлі на сваіх сходах пастановы аб тым, каб усе комсамольцы хадзілі на заняткі вайсковага гуртка, каб вывучалі вайсковую справу. Але дзе там! Яны лепей сходзяць куды-небудзь пагуляць, чым ісьці на заняткі. З гэтай прычыны гурток, які існуе каля 5 месяцаў ніводнага разу добра не правёў сваіх заняткаў.

Вось як нашыя пуцявікі і рухавікі ваенізуюцца.

Райскі.

„Чырвоныя" і „белыя".

(Мястэчка Старобін, Случчына)

Было каля 4-х гадзін раніцы, калі на рынку раздаўся сыгнал і некалькі залпаў з стрэльбаў. Гэта быў знак на збор. Яшчэ перад Дзіцячым Тыднем нашыя павадыры надумалі організаваць гульню. Дзеля гэтага ў школе і на рынку былі вывешаны абвесткі ў форме загадаў. Для цікавасьці можна прывесьці зьмест гэтых загадаў:

21-га праводзім гульню. Усе, хто нарадзіўся у 1910-11-12-13-14 і 15 г. г., усе, хто можа насіць аружжа, дзеці школ і вуліц, прызываюцца ў армію тав. Будзёнага і банду бацькі Махно і г. д.

Цэлыя два дні можна было бачыць каля гэтай афішы кучы людзей, якія са зьдзіўленьнем пыталі адзін у другога, што гэта будзе? Усяго на гульню было зарэгістравана каля 300 дзяцей. Яшчэ перад сьвятам усе зарэгістраваныя былі падзелены на два лягеры—на чырвоных інакш кажучы, армію Будзённага, і белых—банду Махно. Гэтыя лягеры паасобку ў сваю чаргу былі разьбіты на штабы, рэзэрвы, а ў чырвоных была яшчэ і друкарня. Усё было загадзя абгаворана і назначаны месцы штабаў і друкані, што зьяўляецца сакрэтам для другой партыі. Кіраўнікамі гэтых лягераў былі назначаны павадыры атрадаў.

Такім чынам, як толькі раздаўся сыгнал і першыя два залпы, адразу-ж уся плошча рынку была поўна дзяцьмі і дарослымі, якія ўвесь час сталі ў баку і з цікавасьцю наглядалі за гульнёй дзяцей. Адразу белыя і чырвоныя адлучыліся адны ад другіх і тайком накіраваліся ў штабы.

Друкарня чырвоных яшчэ да пачатку гульні пачала сваю працу. Было «надрукавана» (рукапісам) шмат адозваў, плякатаў і лёзунгаў, якія з незамянімай спрытнасьцю былі разьвешаны па мястэчку і нават у штабе ў белых.

Пасьля белыя захапілі друкарню і заперлі яе ў турму, якая знаходзілася у мураванай лаўцы. На вопратках усіх белых былі белыя баньцікі. А каманды склад белых быў адзеты ў вайсковую польскую адзежу; на іх былі польск'я кантовыя шапкі «пазнанкі» і пагоны. Таксама ў белых было некалькі баявых расійскіх стрэльбаў і іншага роду аружжа. Камандзіры-ж мелі пры сабе кожны па рэвальвэру і па шашцы.

Горда і бліскуча ўвашла банда бацькі Махно ў мястэчка і пачала арыштоўваць усіх пападаўшых чырвоных і пачалі раскідваць і руйнаваць зложаныя чырвонымі барыкады. Гаспадарылі яны покуль што, бо ня бачылі, што за іх сьпіною ідзе уся войска чырвоных байцоў. Чырвоныя падышоўшы бліжэй, адразу пашлі ў наступленьне. Ішлі дзьве раці адна за другою. Трэба сказаць, што ў чырвоных былі чырвоныя банцікі, і камсклад таксама быў добра ўзброен. Сам «Будзённы» і «Махно» ехалі на конях, кожны пры сваім атрадзе. Пачалося наступленьне чырвоных і супраціўленьне белых. Увесь час чутны былі выстралы з рэвальвераў і стрэльбаў. Увесь рынак аглушыўся крыкам «ура». Перамаглі чырвоныя. Узяўшы ў палон, яны разброілі ўсіх белых і павялі іх пад конвоем. Пасьля вызвалілі з турмы сваю друкарню і ўсёй агульнай дэмонстрацыяй пашлі да школы, адкуль разышліся па хатах.

Гульня прайшла, як ня трэба лепш, ўсё было організавана. Піонэры і наогул усе дзеці, трымалі сябе як належыць. Уся публіка выказала сваю пахвалу піонэрам.



У сям'і не бяз выродка.

(Несяцкая яч. ЛКСМБ, Клічаўскага раёну, Бабруйшчына)

Яшчэ задоўга да манэўраў, Несяцкая ячэйка ЛКСМ пачала падрыхтоўку.

Амаль усе комсамольцы зусім былі незнаёмы з строем, з маршам ды з іншымі вайсковымі штукамі. Бачаць хлопцы, што аднымі голымі пастановамі нічога не зробіш, ды давай брацца за канкрэтную працу.

На ініцыятыве ячэйкі быў наладжаны нядзельнік і на вырučаныя грошы закупілі розных прыладаў для стральбы на 15 руб., таксама быў зроблены кулямёт—трашчотка.

Заняткі пачалі праводзіцца рэгулярна раз у тыдзень, а два тыдні перад манэўрамі—цераз дзень.

20 жніўня была зроблена трывога. Большасьць комсамольцаў і беспартыйны актыў зьявіліся праз паўгадзіны і эсьпевам, пашлі да зборнага пункту ў Клічаў.

Але сярод нас знайшліся і такія комсамольцы як **Груздз Алісей, Дыбаль** і **Лузаноў**, якія зусім не зьявіліся на манэўры. Гэтага ячэйка міма вушэй не прапусьціла і парашыла **Груздза** і **Дыбаля выключыць з шэрагаў ЛКСМБ**—за дэзэртырства, а Лузанову **вынесьці строгую вымову.**

Несяцкі.

Палачане не адстаюць.

Разам з чырвонаармейцамі.

Два дні да выхаду на манэўры. Комсамольскі атрад з 75 чалавек праводзіць падрыхтоўчыя заняткі. Сутнасьць наступу, як весьці наступ, маскіроўка, атака, пераход стайкай і зьмейкай, сігналізацыя,—усё гэта тлумачыць камандзір і зараз-жа ўсё гэта праводзіцца на практыцы. А пасьля пашлі на манэўры, сапраўдныя чырвонаармейскія манэўры, дзе комсамольцы склалі 5-ю роту №-скага стралковага палка і ўдзельнічалі на правох чырвонаармейцаў.

Далі вінтоўкі, абмундыраваньне. Не спазнаць было комсамольцаў, апранутых у чырвонаармейскую форму.

Увечары, калі трэба было ісьці ў паход, прышлі з музыкай праводзіць нас і астатнія комсамольцы.

* * *

Адышоўшы вёрст 20 ад гораду, у вёсцы Ю. быў зроблены прывал, спыніліся на начоўку.

Назаўтра, а 4-й гадзіне—пад'ём. Пайшлі мы ў паход разам з №-скім стралковым палком. Цэлая калёна выцягнулася на вярсту. Ціха ідуць. Раптам—самалёт „ворага". Калёна ўваходзіць у лес, хаваецца каб «ворага» ня прыкмеціў.

— Ці далёка праціўнік? Калі бой?—гэтае пытаньне ўсіх цікавіла, а асабліва комсамольцаў. Не пасьпелі адыйсьціся і вярсты, як каманда: «прыгатовіць процівагазы», потым—„адзець процівагазы". І хвілін пяць усе ідуць у процівагазах.

Ужо відаць, што „вораг" блізка. Ня ідуць калёнай. Разьбіліся на часьці, ідуць невялікімі групамі—аддзяленьнямі. Ціха прабіраюцца па сьцежках балотаў і лясоў. Ідуць у наступленьне.

Кожнае аддзяленьне ведае сваё заданьне. Хутка будзе «сапраўдны» бой. Гэты бой з нецярпеньнем чакаюць чырвонаармейцы.

Наступ пачаўся. Чутны выстралы, трахканьне кулямётаў, выбух артылерыі. Маскіруючыся, паўзком ідзем далей. Страляем. Трэба перайсьці вялікае басота, каб выгнаць ворага і заняць пункт—вёску. Марудна, але наближаемся. Вораг крыху адкінуты. Нашы падымаюцца на горку. Палажэньне раптам мяняецца.

З права ў лесе „ура". Сінія кінуліся ў аттаку ды выгналі чырвоных. Нязначнае адступленьне, але не надоўга. Зноў наступ чырвоных і больш моцны. Чырвоныя гоняць сініх у лес.

— „Комсамольскі атрад наперад"!—раздаўся загад і мы спрытна паднімаемся і нястройнай сцяной націскаем наперад. Старанна работаюць кулямёты. Але ня гледзячы на гэта сінія рынуліся ў аттаку.

* * *

Ужо 2 з паловай гадзін дню. Усе зморыны. Хочацца адпачыць і паабедаць. Але да месца стаянкі ня так-та блізка.

Толькі к 6-ці гадзінам прышлі на месца. Паабедалі і палеглі спаць.

Ляжым на сене ў нардоме, а за сьцяной бурчыць кіно-апарат. Сядзяць сяляне. Няма вечарынак з п'янствам, а ёсьць культурны вечар. А высока, высока над нардомам тарчыць антэнна. У вёсцы—радыё. І не дарма льлецца пот. Гэтым потам заваёўваецца новае культурнае жыцьцё.

* * *

За ноч адпачыўшы мы ўжо ідзем больш бадзёрыя, зацягваем песьню.

Прайшлі вёрст 12. Комсамольскі атрад разьбіваецца: адзін узвод застаецца, а другі—ідзе ўперад. Адышоўшы з вярсту камандзір тлумачыць, што праціўнік уперадзе і будзе сустрэчны бой. Трэба выслаць разьведку.

Ціха па лесе ідзе разьведка. Бяз гуку,—гаворым рукамі. Маскіруемся. Раптам—выстрал. Гэта—«праціўнік». Праз хвіліну пачынаецца бой. Лес задрыжэў ад выстралаў. Запахла порахам. Абодва бакі наступаюць.

Мы перамаглі.

Праз паўтары гадзіны мы былі ў горадзе.

І. Волкінд.

НА МАНЭЎРЫ!

На гарадзкой вежы гадзіньнік пачаў адбіваць 8 гадзін раніцы.

У гэты час на акраіне Менску, на пляцу праходзілі толькі паасобныя людзі. З вуліцы выехаў селянін.

На вежы прабіла восем.

Як па камандзе з усіх вуліц на пляц паказалася кавалерыя. Праз хвіліну ўвесь пляц быў усеян коньніцай. Там, у канцы калён, спыніліся павозкі з кулямётамі, за імі—абоз.

На манэўрах.

Камандзіры атрымалі баявы загад ад палкавога і перадалі яго чырвонаармейцам.

— Можна курыць,—крыкнуў камандзір.

— Можна курыць... можна курыць, —паўтарылі камандзіры эскадронаў—кожны каля свайго эскадрону.

Заруxаліся, заляскалі шаблямі і пікамі, загамавілі.

— Ну, ты Ахрэмчык, зразумеў баявую задачу?

— Зразумеў,—цьвёрда адказаў кавалерыст, трымаючы адной рукой піку, а другой—цыгарку.

— Як па твойму, хто пераможа на манэўрах?

— Ну, зразумела, мы—адказаў Ахрэмчык,—яны-ж ня ведаюць, што мы атрымалі заданьне ўдарыць ім у тыл.

— Во, калі будзе перапалох! Будуць гэта яны ехаць сабе наперад, а з-заду кулямёты: тра-а-а-а, та, та, та!.. Не пасьпеюць і азірнуцца, як мы іх таго...

— Чаго?

— Ды перастраляем усіх. Не пасьпеюць яны разгарнуцца ў баявую гатоўнасьць.

Да гэтага гуртка чырвонаармейцаў далучылася яшчэ некалькі чалавек. Пачалі маляваць пляны перамогі.

— Яны-ж ня будуць ведаць, будуць ехаць, а тут з лесу выпаўзае бранявік і... пашла работа.

— А што будзе, калі да гэтага яшчэ пусьцім газы? Разаб'ём у пух, нічога яны ня робяць.

Стратэгі гэтага гуртку распрацавалі падрабязнасьці баявога заданьня так, што вораг будзе разьбіты абавязкова. Наскок з тылу... з лесу бранявікі... газы...

— У пахо-о-од!—скамандаваў камандзір полка.

— На коня-я-ях!—пракрычалі камандзіры эскадронаў.

Заляскала зброя. Над коньмі вырасла шчаціна з доўгіх пік. Конь камандзіра крута павярнуў улева. За ім выстраілася каманда з палкавым штандарам.

— Шагам ма-а-арш!

Адна за другою шасьцёркі крута паварачваліся налева. Вось ужо ўвесь полк ідзе па доўгай простай вуліцы. У канцы калёны на брук зьехала апошняя павозка з фуражом.

Далёка наперадзе аркестр зайграў марш Будзёнага.

С. А.

Гэтым нажом перарэжце горла імпэрыялістым.

У мястэчку Астрашыцкі-Гарадок сяляне ўрачыста сустракалі чырвоныя часьці. 5-му пяхотнаму палку былі паднесены букет кветак і нож саматужнага вырабу. На нажы такі надпіс: «Гэтым нажом перарэжце горла імпэрыялістым».

У вёсцы Навасёлкі чырвонаармейскім часьцям паднесьлі вышыты беларускімі ўзорамі ручнік. Праз увесь час паходу часьцей, якія ішлі на манэўры, іх сустракалі вельмі радасна і прыхільна.

* * *

Часьці, якія прымаюць удзел у манэўрах, 23 верасьня занялі пункты, з якіх пачынаюць дзейнічаць.

Штабам кіраўніцтва распрацован плян манэўраў. Уся работа па падрыхтоўцы скончана 23 верасьня вечарам, а 24 верасьня, а 6 гадз. раніцы, манэўры пачаліся.

Усе манэўры разьбіты на 4 ходы, кожны з іх мае сваю асобную мэту. Кожны ход дасьць магчымасьць праверыць падрыхтоўку часьцей за цэлы год па якой-небудзь асноўнай галіне вайсковай вучобы. Палітычнае кіраўніцтва прыстасоўвае палітасьветпрацу да апэратыўнай.

Першы ход манэўраў — сустрэчны бой. Часьці, выходзячы з раёнаў распалажэньня, ідуць да сустрэчы друг з другам і вядуць бой. Пры гэтым ходзе будзе правярацца работа чырвонаармейцаў і кампалітскладу па вядзеньні разьведкі, паходнае аховы і пераходу з паходнага парадку ў баявы. Галоўная мэта палітасьветработы—гэта абслугоўваць у першую чаргу апэратыўнае заданьне. Гэта будзе і ў апошніх ходах манэўраў.

Другі ход манэўраў—абарона для «чырвоных» і наступленьне для «сініх». У другім ходзе прымаюць удзел часьці ДТА—Авіяхіму. Гэты ход мае мэтай праверыць, наколькі часьцямі ўсвоен новы баявы статут.

Трэці ход—такі самы, што і другі, але «чырвоныя» і «сінія» мяняюцца сваімі ролямі. Чырвоныя вядуць наступленьне, а сінія—абарону.

Чацьвёрты ход мае сваёй задачай даць **кавалерыі** навыкі барацьбы з пяхотай, а пяхоце – з кавалерыяй. Задача 4 хода: **атака кавалерыяй калёны пяхоты і артылерыі пры паходным руху і адбіваньне апошняй атакі кавалерыі.**

4 ход—апошні ход манэўраў, пасьля чаго адбудуцца разборы манэўраў на «чырвонай» і «сіняй» старане і закончацца агульным разборам.

Кожны род войск мае пляны правядзеньня кожнага ходу.

К. С.

За ачысткаю вінтоўкі.

МАЗОЛЬНЫМІ РУКАМІ МЫ ТВОРЫМ НОВЫ СЬВЕТ.

„ДЗЕНЬ УРАДЖАЮ“ ПРАВОДЗІЦЦА РАЗАМ З 10-ці-ГОДЗЬДЗЕМ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.

ЗАГАДЗЯ ПАДРЫХТУЕМСЯ, КАБ ПОЎНАСЬЦЮ ПРАДЭМАНСТРАВАЦЬ НАШЫ ДАСЯГНЕНЬНІ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

НЕАДКЛАДАЮЧЫ НІ ХВІЛІНКІ, ТРЭБА ЎЗЯЦЦА ЗА ПАДРЫХТОЎКУ ЭКСПОНАТАЎ НА ВЫСТАЎКУ.

Рыхтуйцеся да выстаўкі.

У гэтым годзе сьвяткаваньне Дню Ураджаю прыстасоўваецца да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі.

Гэтае становішча надае сялянскаму гаспадарчаму сьвяту яшчэ большую адказнасьць, за яго правядзеньне з боку організатараў павялічвае яго задачы.

Сьвяткаваньне пачнецца з 30-га кастрычніка. З гэтага дню пачнуцца падрыхтоўвацца выстаўкі з тым, каб у дзень 7-га лістапада ўжо мець вынікі дасягненьняў сельскай гаспадаркі, каб кажучы аб 10-цігодзьдзі існаваньня савецкай улады, мы маглі на фактах бачыць яе жыцьцёвасьць, яе клопаты аб дабрабыце сялянства.

Дзень Ураджаю ў гэтым годзе праводзіцца ў чацьвёрты раз. І кожны год у гэты дзень на сельска-гаспадарчай выстаўцы нашы вясковыя комсамольцы выяўляюць свае дасягненьні на полі, у агародзе, на сенажаці.

У мінулых гадох на выстаўках прэміраваліся пасевы караньплодаў, кармовых траў, лепшая скаціна і г. д.

У гэтым годзе ў некаторых раёнах сельская гаспадарка перашагнула ўжо даваенны ўзровень, а таму мінулыя мэтады прэміраваньня нас поўнасьцю задаволіць ня могуць у гэтым годзе.

Сельска-гаспадарчым выстаўкам сёлетняга году трэба будзе зьвярнуць увагу на палепшаньне сельскай гаспадаркі **колектыўным ці коопэратыўным шляхам.**

Вясковым гаспадаркам трэба рыхтаваць для выстаўкі прыкладна наступныя экспонаты.

1. Найбольшы ўраджай збожжа караньплодаў, траў, лену і іэш. пры **шматпольн. севазвароце, ужываньні на ўгнаеньне мінэральных парашкоў лубіну, торфу.**

2. Атрыманьне **чыстасортнага насеньня ў сваёй гаспадарцы** (збожжа, караньплодаў, канюшыны, лубіну, вікі, лёну) з мэтай прадаваць яго на рынку. Дасягненьні ў здабываньні корму.

3. Дасягненьне высокіх ураджаяў у садзе і агародзе.

4. Найбольшы удой малака пры правільным утрыманьні, доглядзе і кармленьне каровы.

5. Найбольшая вага маладняка.

6. Атрыманьне вялікай даходнасьці ад пчол.

7. Прыклады шырокага скарыстаньня машын у сельскай гаспадарцы праз машынныя таварыствы,

8. Лепшыя хатнія вырабы.

9. Дасягненьні колектыўных гаспадарак і г. д.

Якія нашы дасягненьні.

«Дзень Ураджаю» у Менскай акрузе.

Згодна пастановы Менакрвыканкому, сёлетні дзень ураджаю па акрузе будзе праводзіцца не 14-га кастрычніка, як у мінулыя гады, а пачнецца 30 бягучага месяца.

У надыходзячы дзень ураджаю мы ставім сабе задачай выявіць, прадэманстраваць перад шырокімі сялянскімі масамі ўсе маючыяся дасягненьні ў розных галінах сельскай гаспадаркі. Дзеля гэтай мэты у кожным раёне ўтвараецца сельска-гаспадарчая выстаўка, на што усім райвыканкомам адпушчана па 200 руб.

Выстаўкі будуць мець аддзелы **паляводзтва, садоўніцтва, пчалярства і па магчымасьці жывёлагадоўлі.** Апошні аддзел мае на мэце выявіць лепшых (племянных) быкоў, жарабцоў, кныроў і бараноў-вытворцаў.

Тыдзень паміж пачаткам выстаўкі і днём 10-ае гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі (30-га кастрычніка—7 лістапада) павінен быць максымальна выкарыстан для наладжваньня **экскурсій і гутарак з сялянамі вакол выстаўкі.** Некаторыя экспонаты с.-г. значэньня (жывёла і інвэнтар) будуць забраны, але павінна захавацца ўся астатняя частка выстаўкі, паказваючая **рост і будаўніцтва вёскі.**

Акрвыканком асыгнаваў патрэбную суму грошай і на прэміраваньне асабліва выдатных сялян—культурных гаспадароў. Ім будуць выдадзены ў якасьці прэмій розныя с.-г. прылады.

— Няма дрэннай зямлі, ёсьць дрэнны гаспадар,—вось лёзунг, які павінен знайсьці свой адбітак на с.-г. выстаўцы, праходзіць праз яе чырвонай істужкай.

Я. З—р.

„Дзень Ураджаю“ у гэтым годзе.

Якія задачы народнага сьвята?

Як і ў папярэднія гады, сьвяткаваньне «Дню Ўраджаю» у гэтым годзе, **асабліва ў сувязі з 10-ці годзьдзем Кастрычнікавай рэволюцыі, павінна мець характар шырокай народнай урачыстасьці.**

Прытрымліваючыся ў агульным такога **грамадзкага характару,** сьвята «Дзень Ураджаю» павінна мець у той самы час **агрыкультурны і палітычны зьмест.**

«Дзень Ураджаю» павінен прайсьці пад лёзунгамі **высьвятленьня дасягненьняў і недахопаў за 10 год існаваньня саветаў у справе ўзмацненьня соцыялістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы і далейшае будаўніцтва ў гэтым напрамку.**

Задачай «Дню Ўраджаю» павінна быць:

— Падвядзеньне **вынікаў** бягучага сельска-гаспадарчага году і **параўнаньне** іх з дасягненьнямі мінулых гадоў.

— Выяўленьне **прогрэсыўных гаспадарчых дасягненьняў раёну** у цалку, і асабліва ў справе **земляўпарадкаваньня.**

Дэманстрацыя гаспадарчых **дасягненьняў** савецкіх, колектыўных гаспадарак, пасёлкаў паасобных перадавых вёсак, сялянскіх гаспадарак у напрамку інтэнсіфікацыі гаспадарак, асабліва ў адносінах вырашэньня кармовага пытаньня.

Знаёмства з дасягненьнямі ў галіне **вытворчага коопэраваньня** сялянскіх гаспадарак.

На падставе выяўленых паказаных дасягненьняў **прапаганда за далейшую гаспада чую культурную працу** за пабудаваньне новай соцыялістычнай вёскі на груньце шырокай **самадзейнасьці,** коопэраваньня насельніцтва, пераход на пасялковую форму землякарыстаньня.

Папулярызацыя грунтоўных задач і лёзунгаў сельска-гаспадарчай політыкі Савецкай улады ў Беларусі: **с-гаспадарка індустрыялізацыя, разьвіцьцё тmake**варнасьці ў сялянскіх гаспадарках, узмацненьне мэліорацыі і прыцягненьне да гэтай справы шырокіх масаў сялянства, вытворчае коопэра-

ваньне, узмацненьне колгаспадарак, пасёлкаў, як найлепшых форм землякарыстаньня, разьвіцьцё агнятрывалага будаўніцтва.

Папулярызаваньне грунтоўных агрыкультурных задач, **спэцыфічных** для данага раёну. Наладжваньне грамадзянскага ушанаваньня асоб, якія саслужылі вялікую ролю ў справе паляпшэньня дабрабыту бядняцтва, у справе узмацненьня сельскай гаспадаркі раёну.

Сьвяткаваньню «Дню Ураджая» павінен быць прыдадзен мясцовы **характар,** а таксама магчымасьць шырокага уцягненьня сялянскіх гаспадарак.

Вось у асноўным тыя задачы, якія стаяць прад «Днём Ураджаю» у гэтым годзе. Яны будуць поўнасьцю выкананы, калі да гэтага **народна-бытавога сьвяткаваньня будзе праведзена належная падрыхтоўка.**

У чарговым **нумары будуць зьмешчаны матар'ялы, як найлепш падрыхтавацца і правесьці сьвята «Дзень Ураджаю».**

Коўбчанцы рыхтуюцца.

(Коўбчанская ячэйка ЛКСМБ, Бабруйскае акругі).

Комсамольцы Коўбчанскай ячэйкі вясной г. г. старанна ўзяліся за правядзеньне карысных агракультурных пачынаньняў у сельскай гаспадарцы. Увядзеньне засеваў культурных траў, сэрадэлі, корняплодаў—рэдкі госьць у комсамольскіх гаспадарках.

Таксама комсамольцы ў гэтым годзе практыкавалі пасадку капусты па парады агронома.

Асабліва шмат зроблена комсамольцамі новага ў сваёй гаспадарцы ў сувязі з вясеньняй пасяўной кампаніяй.

Зараз ідзе ўпартая пвдрыхтоўка да Дню Ўраджаю. У гэтым годзе з нашай вёскі экспонатаў на выстаўцы будзе досыць шмат, бо ёсьць многа культурных увядзеньняў у гаспадарках.

М. К.

Ноч у Пацічова

З пізкага неба сумнага цьмянага кобру упалі першыя кроплі дажджу, калі мы пад'ехалі да Пацічова. Конь стаў, падрыўшы галаву і прыслухоўваючыся да [illegible] шорахаў васеньняга вечару. У цёмнай шэрсьці дрэў, дзесьці ў туманнай глыбіні ўвяз аганёк. Мы ўбачылі, як аганёк раптам задрыжэў, захістаўся, пачуўся глухі шум. Нехта бег да нашай падводы—нябачны ў змроках.

— Хто?

— Воўк, не пазнаеш?

— Хлопцы—вы?.. Да нас... Ідзіце хутчэй у хату, я каня адвяду...

Так, гэта быў шырокаплечы Воўк—адзін з пяці. Тут, у загубленым Пацічове, далёка ў баку ад тэлеграфных слупоў гасьцінцу, ля краю лесу, што густа цягнецца аж да самага Барысава, жывуць гэтыя пяцёра—сябры сельска-гаспадарчай комсамольскай арцелі «Комсамольская Воля», адзінай комсамольскай арцелі на Беларусі. Калі чорнай іржаўчынай раньняй вясны пакрыліся сьнягі, па размытых дарогах, за дзесяткі вёрст прышлі яны ў Пацічова, на адпушчаны ім кавалак былой панскай зямлі, каб працаваць і перамагаць. Сёньня—восень. Ці ёсьць у іх пуні жыта, а ў сэрцы даўнейшая бадзёрасьць і сіла?

У хаце гарадзкіх гасьцей частуюць яешняй, малаком і хлебам. Волька гаспадыня—маўклівая і сьціплая—сядзіць на ложку і глядзіць на нас мярцаючым поглядам добрых вачэй. Яе мужык—Васіль—пільнуе сад. За вакном спакойна і роўна шуміць дождж, у хаце цёпла, сьвеціць маленькая газьнічка і па-правінцыяльнаму чотка выстуквае сэкунды стракаты насьценны гадзіньнік.

Пятрусь Чыкун—старшыня арцелі—парушае цішыню. У яго сьветлыя валасы, тонкі бледны твар, ён глытае словы, пасьпяшаючы ўсё нам расказаць, усім падзяліцца.

Скуратаўскія яны—ён і Воўк, з балоцістых Скурат, што ў 10 вярстах ад Смалявіч. Прачытаў у мінулым годзе Воўк апавяданьне ў часопісу «Малады Араты» аб тым, як комсамольцы комуну організавалі ды трактар набылі. Вельмі ўжо прыгожа было напісана. Спадабалася Воўку гэта апавяданьне, пазнаёміў з ім Пятруся. І неяк само сабою нарадзілася думка: давай організуем комсамольскую арцець--слаўна гаспадарыць будзем! Але жыцьцё аказалася непадобным да кніжкі. Калі ўжо была знойдзена зямля і атрыман дазвол РВК, таварышы--скуратаўскія комсамольцы «здрэйфілі» — адмовіліся ісьці ў арцель. Іх адгаварылі бацькі--сяляне, якія сьмяяліся над гэтым «шаленствам».

Чыкун і Воўк засталіся з сваімі марамі. «Раз пачалі--трэба скончыць--сказаў Чыкун--ідзем Воўк, будзем самі працаваць» У Пацічова яны перабраліся, калі дагараў сакавік, сталі мокрыя дні ўпарта не жадаўшай уходзіць зімы, марэзьлівы вецер варушыў стрэхі.

Прышэльцаў сустрэлі злобна і насьмешліва.

На гаспадарцы, перадаиай комсамольскай арцелі, жылі арандатары. У хату новых гаспадароў ня ўпусьцілі, сябры пасяліліся часова ў халоднай пустой школе, начавалі па печцы, падкладваючы пад галаву куль саломы. Было цяжка і крыўдна. Воўк глядзеў сапрадным воўкам і калі-ні-калі, ў шчырыя начныя хвіліны роспачы прапанаваў Чыкуну кінуць усё і зьвярнуцца ў Скураты. Але Пятрусь казаў «кінь ты, усё будзе добра» і Воўк змаўкаў.

Гаспадарка, якую павінны былі яны паставіць на ногі, была запушчаная. Арандатары сеялі толькі жыта, гною ня клалі—зморвалі зямлю. Сад ня быў агароджаны, у раскіданай пуні гуляў вецер...

Вышлі яны ў поле рана, перад вялікаднем.

Сяляне з усьмешкай сачылі за іх працай (яшчэ ніхто не ўзараў) і адплёўваліся: «вось басякі — і што ты з імі зробіш»?

Вясна расла, прасыхалі двары, пацічоўскі пастух выразаў з чарота новую дудку. Да Воўка і Чыкуна прылучыўся комсамолец—батрак Зьмітрок Фядотаў (у арцель яго прынялі бяз усякага ўкладу). Яны працавалі цэлыя дні, а ночы праводзілі ў саломенай будцы ў садзе, саграваючы адзін аднаго ў цяжкім сялянскім сьне.

У чэрвені блеснула радасьць—ЦК комсамолу прышоў арцелі за дапамогу і яны атрымалі 1000 рублёў крэдыту з Белсельбанку. Грошы былі зараз-жа рэалізаваны. Купілі добрую малатарню нямецкай сыстэмы, варху, саломарэзку, каня, карову, пару іёркшырскіх сьвінак, насеньне, розную гаспадарчую дробязь. Да гэтага часу ў арцель ўступілі два новыя члены—Васіль Трапашка з жонкай Волькай. Яны прывялі ў арцель сваіх кароў, прыцягнулі хатні скарб. І зажыла «Комсамольская Воля» добрай сялянскай сям'ёй.

Зямля ўся была выкарыстана—засеялі аўса, вікі, лубіну, картоплі, буракоў. На балоцістай сенажаці сажалку выкапалі, залажылі два дрэнажы і канаву ў 200 мэтраў, адвялі крыніцу ў раку. Земляны склеп пабудавалі, грамадзкі калодзеж пачынілі. Інакш сталі пацічоўскія хутаране прыгледжвацца да комсамольцаў. Усё часьцей сталі прыходзіць у адзінокую хатку арцелі за спраўкай, за парадай, з просьбай напісаць заяву, ці папакарыстацца малатарняй: «лёгка яна ідзе... Чыста малоціцца». Заявы, зразумела, пішуцца, спраўкі даюцца, а за карыстаньне малатарняй арцель бярэ невялічкую ўзнагароду жытам, прычым беднякам тут буйная ільгота.

Патравы на палёх арцелі, якія раней былі такія частыя, зусім спыніліся... Аўтарытэт пацічоўскіх комсамольцаў - арцельшчыкаў няпрыкметна ўзрастаў. У кузьні, дзе звычайна зьбіраецца народ пабалакаць, хітры дзед Андрэй нядаўна так гаварыў:

— Чорт з імі справіцца... Я-б ніколі нумаў,я д што гэтак будзе... Арцель-жа, комунія, думаў, што будуць працаваць 8 гадзін у дзень і гультаяваць... Ажно палядзі ты—як устануць, дык раней за нас! Ты палядзі, якое яны сена ўбралі—зялёнае, ні разу пад дажджом ня было... Палядзі, які авёс у іх бярэцца...

Адно не спадабаецца дзеду Андрэю—што арцель канавы на сенажаці праводзіць:

— І выдумалі-ж нейкія канавы капаць... На чорта гэта ім!.. Чыкун абрывае апавяданьне...

Падняўшыйся вецер парушыў сонную музыку дажджу. Аб чымсьці спужана зашумелі мокрыя верхавіны. Мы вышлі з хаты. Уперадзе ідзе Пятрусь з ліхтаром у руцэ, ён вядзе нас у абору—доўгі прасторны будынак—на начлег. Воўк загарнуўся ў кажух і пашоў зьмяніць Васіля, Зьмітрок паслаўся ў хаце.

Закопваючыся ў сена, Пятрусь ня спыняе апавядаць аб арцелі—бачна, што клапотамі аб ёй да верху запоўнена яго жыцьцё—аб ботах, што нядаўна купілі для Воўка, аб іоркшырскіх сьвінках, ураджаі яблык, лёзунгу «Ад кожнага па здольнасьцях—кожнаму па патрэбнасьцях», як'я яны ажыцьцяўляюць на справе... І ніжэй, глухім шэптам—аб тым, што іх хочуць надпаліць былыя арандатары, што прыходзіцца пільнаваць ня толькі сад, але і ўсе будынкі...

Дзесьці побач усхрапваюць коні, шаркае па страсе верасьнёўскі вецер.

. . . .

Нехта рэжа бляху. Няпрыемныя рэзкія гукі настойліва ўюцца навокал. Я жадаю крыкнуць, каб спынілі—і прасынаюся. Сіняваты сьвет золка запоўніў абору. У куце, у адгароджаным хлявушку, Волька доіць кароў. Тонкая белая струйка б'е па дну вядра. Аднекуль вынырнуў вясёлы і дзелавіты Пятрусь, зачарпнуў у Волькі малако ў гліняную чашку:

— Глядзі—буду сьвінак карміць...

Сьмешныя парасяты, перашкаджаючы адзін другому розавымі хабаткамі, хлебаюць малако.

— Вось падрасьце бораў—Чэмбэрленам назавём...

Сёньня нядзеля. Зранку хлопцы, вольныя ад працы, рыюцца ў кніжках, якія мы ўчора прывезьлі. Разам з гэтым папаўненьнем у іх цяпер будзе добрая бібліотэчка. А да чытаньня—вялікая ахвота. Асабліва, калі літаратура па сельскай гаспадарцы. Я знайшоў на стале Сельска-Гаспадарчую Энцыклёпэдыю Баўэра», «Піонэры новай вёскі» Кісялёва, «Рукаводзтва па малочнай гаспадарцы», нумары «Плуг» і «Сам сабе агроном». У ціхія вячэрнія гадзіны, калі ня трэба вартаваць сад, хлопцы перамагаюць гэтыя старонкі. Ня лёгка даецца...

Але прачытанае ў кнізе можна прыстасаваць у жыцьці. Арцель адразу-ж павяла сваю гаспадарку культурнымі мэтадамі. Глыбокае раньняе ворыва, радавы пасеў, дацкія кармушкі (пацічоўскія комсамольцы першыя пабудавалі такія кармушкі—цяпер сяляне бяруць прыклад), уцяпленьне хлявоў—усяму гэтаму навучылі кнігі...

Трэба сьпяшацца да цягніка.

Дапіваем таварыскую гарбату ў прыкуску.

Дождж прыўціх, але неба ня ведае—ух! мыльнуцца, ці працягваць ціханька пакрыўджана плакаць...

Разьвітаючыся з намі, Воўк кажа:

—Праз месяц—і я крануся... У армію іду служыць...

—А як-жа арцель?

—Нічога, выжыве!

—Справімся,—падцьвярджае Чыкун.

Застаяўшыся конь тузае драбінку.

—Ну, бывайце здаровы...

—Усяго, хлопцы... Часьцей-бы прыяжджалі... Усе-ж такі сумнавата...

Чыкун ухмыляецца, ён бяз шапкі, валасы яго ледзь-ледзь варушацца.

Конь, ня вьщерпеўшы, сарваўся і пабег, халодныя брызгі ляцяць у бакі, нам нешта крычаць на ростань, што—не разьбярэш.

Міх. Гольдбэрг.

„ЮНГЭР АРБЭЙТЭР“—5 ГОД.

Гэты юбілей адзначае ўвесь ЛКСМБ.

Вечар у клюбе Карла Маркса.

27-га верасьня спаўняецца пяцігадовы юбілей газэты яўрэйскай рабочай моладзі, органу ЦК ЛКСМБ—„Юнгэр Арбэйтэр“.

Газэта нарадзілася ўвосень 1922 году.

З першых-жа дзён свайго існаваньня „Юнгэр Арбэйтэр“ змагаецца супроць наведваньня моладзьдзю сінагог, за адрыў яе ад клерыкальных уплываў, зьяўляецца ініцыятарам паказальных судоў над прадпрыёмцамі, эксплёатуючымі рабочую моладзь ды інш.

Ня толькі комсамольцы, але і ўся яўрэйская рабочая моладзь сустрэла „Юнгэр Арбэйтэр“ з вялікім энтузіязмам, прывітала яго, як свайго абаронцу, барацьбіта за здавальненьне яе экономічных і культурных запатрабаваньняў.

Ня гледзячы на няспрыяючыя ўмовы для работы (адсутнасьць памяшканьня для рэдакцыі, сродкаў, шалены паход супроць яе з боку ўсіх клерыкальных элемэнтаў) газэта прадаўжала існаваць і рэгулярна выходзіць.

„Юнгэр Арбэйтэр“ удзяляе шмат увагі пытаньням вучобы і работы комсамолу і ўсёй яўрэйскай і рабочай моладзі, яе ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве, праводзіць розныя кампаніі і конкурсы.

З праведзеных газэтай кампаній трэба адзначыць наступныя: колектыўныя паходы моладзі ў тэатр, конкурс на лепшую местачковую ячэйку па пастаноўцы экономработы, барацьба з клерыкалізмам, экскурсія ў Маскву дэлегацыі яўрэйскай рабоча-сялянскай моладзі і г.д.

Аб росьце ўплыву і аўтарытэту газэты ў масах яўрэйскай рабочай моладзі гораду і мястэчка лепш усяго сьведчыць рост юнкораў. Калі ў першыя дні існаваньня „Ю. А.“, прыходзілася сілком цягнуць комсамольцаў да корэспондаваньня, дык зараз газэта налічвае звыш 400 юнкораў, з якімі падтрымліваецца цесная сувязь, шляхам сталай перапіскі.

* * *

У сувязі з пяцігадовым юбілеям „Юнгэр Арбэйтэр“, сёньня, 27-га верасьня, а 8-й гадзіне ў клюбе імя Карла Маркса адбудзецца вялікі юбілейны вечар. У праграме: 1) Урачыстая частка і 2) концэрт.

Білеты можна атрымаць у райкомах.

Акруговая партыйная конфэрэнцыя.

Апошні пленум Менакругкому КП(б)Б пастанавіў склікаць на 14-е лістапада акруговую партыйную конфэрэнцыю.

Абвестка дню конфэрэнцыі наступная: 1) даклад ЦК КП(б)Б; 2) даклад АК КП(б)Б і садаклад акругкому ЛКСМБ; 3) даклад рэвізыйнай камісіі; 4) справаздача АКК; 5) вынікі і далейшыя перспэктывы гаспадарчага будаўніцтва ў акрузе; 6) аб рабоце ў вёсцы; 7) выбары.

Лес—беднаце.

За гэты год сялянству Беларусі прададзена лесу ў крэдыт на 750 тысяч рублёў. Дармова адпушчана лесу на 300 тысяч.

Дармова лес адпушчаўся бяднейшаму сялянству праз камітэты сялянскай узаемадапамогі.

Дэмабілізаваных чырвонаармейцаў—на работу.

Наркампрацы БССР даў указаньне аб замацаваньні месцаў на вытворчасьці, якія аслабаніліся пасьля ўходу прызыўнікоў 1905 году, **для дэмабілізуемых у гэтым годзе чырвонаармейцаў.**

Акрамя гэтага, **дэмабілізаваныя чырвонаармейцы павінны пасылацца ў першую чаргу на работу ў працкалектывы.**

Эпідэмія малярыі.

Згодна вестак Наркамату Аховы Здароўя, на тэрыторыі БССР (у Мазырскай акрузе) зьявілася эпідэмія малярыі.

Дзеля змаганьня з эпідэміяй, намечана правесьці ў малярыйных мясцовасьцях меліорацыйныя работы з мэтай зьнішчэньня балотных камароў, якія разносяць заразу.

Лішнія прадстаўніцтвы ліквідаваны.

Калегія Наркамату Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі закончыла праверку ўсіх цэнтральных прадстаўніцтваў, якія існуюць у БССР.

У выніку праверкі з агульнага ліку 102 прадстаўніцтваў пастаноўлена ліквідаваць 48, з скарачэньнем штатаў на 422 адзінкі.

У тры радкі.

○ **Ва ўсебеларускую школу сьляпых дзяцей** будзе прынята новых 55 чал.

○ 22-га верасьня **пачаліся заняткі ва ўсіх вячэрніх школах павышанага тыпу і рабочай моладзі.**

○ Па БССР **пачалі працаваць дзіцячыя сады,** у якія сёлета прынята 5000 дзяцей.

○ На **пераабсталяваньне яўрэйскага рабочага клюбу імя Леніна і польскага імя Розы Люксэмбург** адпушчана 25 тысяч рублёў.

○ **У працоўных колектывах БССР занята зараз 7000 рабочых.**

○ **Курсы па вывучэньню стэнографіі,** арганізаваныя Наркамасьветай, будуць укомплектаваны ў канцы верасьня.

○ Утвораны **першы беларускі сымфонічны оркестр** у складзе 50 музыкаў.

○ Пры менскім вячэрнім рабочым унівэрсытэце будзе організавана **завочнае навучаньне для іншагародніх студэнтаў.**

○ Менакрвыканком адпусьціў кожнаму раёну **па 20 рублёў на організацыю сельскагаспадарчай выстаўкі ў „дзень ураджаю“.**

○ Пры Беларускім Дзяржаўным Музэі організуецца **аддзел прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.**

○ **Усебеларуская саматужна-прамысловая выстаўка** організуецца ў канцы г. г. Інбелкультам.

○ **У Менскі вячэрні рабочы ўнівэрсытэт будзе прынята 120 чалавек.**

Кастрычнік ідзе. Як сьвяткуюць профсаюзы.

Організуюцца вытворчыя вечары.

Зацьверджан плян сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі профсаюзамі БССР.

Пры ўсіх ЦП, акруговых і раённых аддзяленьнях саюзаў, а таксама пры мясцкомах, фабкомах і завкомах утвораны і ўжо разгарнулі энэргічную дзейнасьць спэцыяльныя камісіі па падрыхтоўцы да сьвята. Набываецца літаратура аб Кастрычніку, рыхтуюцца вечары і карнавалы.

Вядзецца работа па выяўленьню ўдзельнікаў Кастрычнікавых падзей і грамадзянскай вайны з мэтай прыцягненьня іх на наладжваемыя **вечары ўспамінаў.**

У пачатку кастрычніка на ўсіх прадпрыемствах, клюбах, на агульных сходах рабочых, служачых і іх утрыманцаў будуць праведзены даклады і гутаркі на тэмы:

— Дасягненьні профсаюзаў СССР да 10-й гадавіны Кастрычніка;

— Роля УсеКП і КП(б)Б у Кастрычнікавай рэволюцыі;

— Наша соцыялістычнае будаўніцтва і

— Міжнародны профрух.

Організуюцца вытворчыя вечары, з мэтай выяўленьня дасягненьняў і недахопаў кожнага прадпрыемства.

Ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце будзе зьвернута галоўная ўвага на **ўцягненьне ў сьвяткаваньне ўсіх членаў профсаюзаў.**

Мастацкія плякаты.

Вышлі з друку 4 мастацкія плякаты, адбіваючыя гісторыю рэволюцыйнага руху ў БССР і ў прыватнасьці лютаўскіх і кастрычнікавых падзей 1917 г.

Плякаты зьмяшчаюць у сабе шмат малюнкаў, фотографій і тлумачэньняў да іх, каляндар падзей і г. д.

Тыраж кожнага плякату—2000 экзэмпляраў.

Для чароўных ліхтароў.

Да 10-ай гадавіны Кастрычніка Гістпарт ЦК КП(б)Б выдае сэрыю мастацкіх дыяпозытываў для чароўных ліхтароў, у якіх знойдзе свой адбітак гісторыя рэволюцыйнага руху на Беларусі і ў асаблівасьці Кастрычнікавай рэволюцыі і грамадзянскай вайны.

Дыяпозытывы будуць гатовы ў канцы кастрычніка і своечасова разасланых па акругах.

Выстаўка літаратуры.

Дзяржаўная унівэрсытэцкая бібліотэка дзейна рыхтуецца да Кастрычніка. У дні сьвята будзе адчынена вялікая выстаўка літаратуры, якая адаб'е гісторыю Кастрычнікавай рэволюцыі, а таксама нашы гаспадарчыя і культурныя дасягненьні за 10 гадоў.

Падарункі вясковай дзетвары.

Менская акруговая камісія па падрыхтоўцы сьвяткаваньня 10 гадавіны Кастрычніка выпрацавала плян правядзеньня дзіцячага сьвята ў вёсцы.

Кіраўніцтва ў сьвяткаваньні дзяцьмі Кастрычніка павінна належыць комсамольскай організацыі і школе.

Для дзяцей неабходна ў дні сьвята організаваць гутаркі, экскурсіі, прагулкі і вечары **падрыхтаваць для іх падарункі.**

Сродкі для ўсіх гэтых мерапрыемстваў павінны быць сабраны пры ўдзеле шэфаў, таварыства „Прыхільнік дзяцей“, коопэрацыі інш. грамадзкіх організацый.

Новыя кніжкі да Кастрычніку.

Цэнтральная юбілейная камісія пры ЦВК БССР сумесна з Гістпартам ЦК КП(б)Б выдала шэраг кніжак да 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі. Акрамя ўжо вышаўшых з друку кніжкі А. Чарвякова і зборніку С. Агурскага—абодвы пад назвай „Кастрычнік на Беларусі“, падрыхтавана да друку брашура А. Кіржніца—„Люты і Кастрычнік у Беларусі і на Заходнім фронце“ (гістарычны нарыс).

Падрыхтоўваецца да друку кніга аб гісторыі рэволюцыйнага руху і компартыі на Беларусі да 1917 году.

Апроч таго, рыхтуецца да друку зборнік **М. Шапавалава** аб гісторыі Беларусі і КП(б)Б пачынаючы з канца грамадзянскай вайны і да апошняга часу (1920—1927 г. г.).

Суд.

„Ску-ш-на-а-а...“

Панас Кудрашоў пацягнуўся на палацях і моўвіў:

— Ску-ш-на-а-а...

Яму адказалі браты:

— Але... Скушна...

Сапраўды, у Рудакоўскім сельсавеце Віцебскага раёну сумна. Ніводнага вечару, гулянкі, ды кірмашоў таксама даўно ня было.

І, зразумела, чаму, браты Кудрашовы, прыхапіўшы яшчэ з сабой Васіля Дашчэнка, парашылі „павесяліцца“.

Позна ўначы вышлі яны на вуліцу вясковай аколіцы.

Накіравалася вясёлая кампанія на хутар удавы Сімухінай. Вышаўшую насустрэч старуху зьбілі. Гэта была першая ахвяра. Далей звар'яцела б лі ўсіх жанчын у хаце—ніхто не супраціўляўся. Для фасону далі некалькі стрэлаў у паветра.

З адным хутарам было скончана. Накіраваліся на другі. На дарозе сустрэлі 7-мігадовага хлопчыка. Яго парэзалі нажом.

Вось і другі хутар. Як толькі загрукалі ў дзьверы, вышаў гаспадар Кісялёў. Панас Кудрашоў хутка ўбраў перашкоду—удар нажом, і Кісялёў заліўся крывёю...

У гэты час аблава, арганізаваная сялянамі, злавіла ўсіх „малайцоў“.

Справу разглядзеў Віцебскі акруговы суд. Па пастанове суду „малайцы“ будуць цяпер разганяць свой „сум“ у Віцебскім справіцельным доме. Панас Кудрашоў на працягу 5-ці год са строгай ізаляцыяй, Ляксей і Пётра Кудрашовы, а таксама і Васіль Дашчэнка—на працягу двух год.

Вярхоўны суд БССР з гэтай мерай згадзіўся.

Эмт.

КАЛІ ХІСТАЕЦЦА ПУШКІН...

„Я памятник воздвиг себе нерукотворный“.
А. ПУШКИН.

Ля кіно «Культура» стаяць у чарзе ча білетамі на фільм «Поэта і цар». Тут і рабочыя хлопцы, прыбегшыя з заводу ў часе перапынку на абед, піонэры, намазёваныя паненкі, якіх так цікавіць рамантычнае жыцьцё Пушкіна... У часе рга толькі і гавораць аб цудах амэрыканскай рэклямы Белдзяржкіно. На пляцу Волі будуецца «помнік» вялікаму поэту. Гэта робіцца з мэтай рэклямаваць фільм «Поэта і цар».

Нейкі дзядзя разважае:

— Во, сукіны дзеці, накінулі ксяндзоўскую пэлярыну, на дзюркі паклалі заплаты і гавораць, што гэта помнік Пушкіну. Калі ён такім будзе ў фільме—выйдзе цікава. Таму і білет куплю...

А тым часам на пляцу Волі падвыпіўшыя кантралёры «Культуры»—«таленавітыя мастакі» заканчвалі «помнік» поэту.

Вось падняты ўжо бюст. Кантралёр выцягнуўся. Наступіў урачысты момант—публіка запляскала ладошкамі, пачуўся сьвіст.

— Гатова,—крыкнуў кантралёр, але раптам цудоўны «помнік» захістаўся.

— Трымай Пархуцька яго!—крычалі кантралёры.

Пушкін хістаўся. Яго ногі прыбівалі да рыштаваньня цьвікамі. З падраных парткоў, якія начапілі на «помнік», паказалася салома.

Адна старушка зазначыла:

— Начапілі сьпінджак, а ўначы хто-небудзь абавязкова сьцягне.

У натоўпе адказалі:

— Дуракоў мала... Глядзі, латак ня зьлічыш...

— А буцы-та адкуль сьцягнулі?.. Да нас адзін цыган у такіх прыходзіў.

Нарэшце, «помнік» пастаўлены. Загадчык кіно і кантралёры з пагардай аглядаюць свой твор, вакол якога гусьцее натоўп...

* * *

Ад нас скажам: Рэкляма—добрая рэч тады, калі яна застаецца толькі рэклямай. **Але калі рэкляма пераходзіць у зьдзекі над вялікім поэтам—гэта ўжо брыдота, супроць гэтага трэба сказаць цьвёрдае слова.**

У свой час вялікі поэта пісаў: «Я памятник воздвиг себе нерукотворный». Белдзяржкіно з гэтым ня згодна. Як гэта—«нерукотворный»? І пушчаюцца ў ход рукі, да якіх не хапае маленька... розуму.

К. Т.

Васеньні розыгрыш па футболу.

У нядзелю 25 верасьня пачаліся гарадзкія **васеньнія матчы па футболу.** Удзельнічае 6 лепшых каманд гораду.

У першы дзень гулялі каманды дрэваапрацоўнікаў і БДУ. Перамога на баку БДУ.

Новыя гурткі.

За апошні час організавалася шмат новых гурткоў фізкультуры ў горадзе.

У БДУ запісалася ў гурток каля 120 чалавек, у краўцоў—больш 100 і ў харчавікоў—каля 50 чалавек.

Лыжная станцыя.

Бюро фізкультуры ЦСПСБ вядзе падрыхтоўку да адчыненьня лыжнай станцыі ў Менску.

Да маючыхся 60 пар лыж, дакупляецца яшчэ 50. Гэта колькасьць недастаткова, бо ў мінулым годзе наплыў на станцыю быў да 500 чалавек у дзень.

Зімовае сьвята.

ВСФКБ пастанавіў правесьці ўсебеларускае зімовае сьвята фізкультуры ў **сьнежні.**

Сьвята зьявіцца новай праверкай фізкультурных дасягненьняў працоўнай моладзі.

Да зачыненьня Менскай пляцоўкі.

Да закрыцьця пляцоўкі ў Менску прыстасаваны спаборніцтвы па вайсковаму пяцібор'ю, у якія ўвойдуць бег на 100 мэтраў, граната, стральба і хадзьба на 3000 м.

Пляцоўка за летні сэзон прапусьціла звыш 80.000 чалавек.

2 мільёны экономіі.

НК РСІ правёў грунтоўную рацыяналізацыю дзяржаўнага апарату БССР.

Значна скарочаны штаты ўстаноў. Замест 5562 служачых, пакінута 3625 (скарачэньне на 33 проценты).

Праводзіцца вялікая работа **па спрашчэньню справаздачнасьці.**

Шмат пытаньняў, якія дагэтуль разшаліся толькі ў цэнтры, зараз будуць вырашацца мясцамі: у райвыканкоме, сельсавеце, гарсавеце. З прычыны таго, што правы мясцовых органаў пашыраны, ня трэба будзе па ўсякіх дробным пытаньням перапісвацца з цэнтрам.

Нарэшце, ад спрашчэньня апарату мы будзем мець вялікую экономію, якая выявіцца для Беларусі **ў суме ня менш 2 мільёнаў рублёў у год.**

Гэтыя грошы пойдуць на прамысловасьць і сельскую гаспадарку,—на будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне.

ОЗЭТ.

Акраддзяленьні ОЗЭТ'а падрыхтоўваюць да сьвята спэцыяльныя выезды ў яўрэйскія колектывы.

Будуць організаваны новыя чырвоныя куткі, школы ў яўрэйскіх пасёлках.

Да сьвята прадпалагаецца прыстасаваць адчыненьне новых сельскагаспадарчых колектываў.

Адказы чытачам.

Пархімовічу (№ 1079). Каб стаць дзяткорам „Беларускага Піонэра“, трэба рэгулярна дасылаць у часопіс допісы аб працы піонэратрадаў і школ.

Вярлінскаму. (№ 1084). Каб хутчэй атрымаць кандыдацкую картку, трэба зьвярнуцца ў акругком ЛКСМБ.

Эм. (№ 1085). Вэнэролёгічны дыспансэр у Менску ёсьць. Хворым гарантуецца поўная тайна лячэньня.

Нэлюку. (№ 1086). Спэцыяльнай кавалярыйскай школы ў Менску няма. У двух вайсковых школах, якія тут існуюць, разам з агульнай вучобай, праходзіцца і кавалярыства.

Мінкову. (№ 1087). Канчаткова ў кандыдаты ЛКСМБ зацьвярджае акругком ЛКСМБ. Тое, што ты яшчэ ня маеш кандыдацкай карткі, ня значыць, што ты не кандыдат комсамолу.

Чарняўскаму. (№ 1088). На новы скураны завод у Менску належны лік рабочых прыняты, і покуль што новыя не патрэбны.

На хвалі ... мэтраў.

(Менская рад...-станцыя імя Саўнар...му БССР).

Сёньня перадаецца 7 г. 00 хв.—Гутарка ВСФКБ **„падрыхтоўка новага кадру фізкультурнікаў“;** 7.30—**Беларуская радыё-газэта № 165;** 8. 15—**Гутарка з хатнімі гаспадынямі;** 8. 45—Даклад ВСНГ **аб вытворчасьці ў БССР;** 9. 15—**Концэрт.**

Заўтра будзе перадача: 7 г. 00 хв.—Гутарка ўрача **„Сухоты ў БССР“;** 7. 30—**Радыё-газэта № 166;** 8.15.—**Эспэранта—радыё-газ**та; 845—Даклад ЦК МОПР'у **«Вынікі ... нуму ЦК МОПР'у;** 9. 15.—**Концэрт.**

Куды пайсьці.

Сёньня ў кіно-тэатрах Белдзяржкіно па... наюць дэманстравацца наступныя фільм... „КУЛЬТУРА“—вялікі баявік **„Поэта і цар“**; „ПРОЛЕТАРЫ“—**„Сьвежы вецер“** (вытворчасьць ВУФКУ; „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“—за... межны фільм **„Загавар Максаленіі“.**

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 1 друкарня БДВ.